ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 2 (5058) 17 студзеня 2020 г. ISSN 0024-4686

16+

Прыхаваны драматызм паэта стар. 5

Хвалі эмоцый Вячаслава Паўлаўца стар. 12

У бальнае падарожжа стар. 15

Гонар і годнасць

Фота БелТА.

Новы год упэўнена ўваходзіць у наша жыццё. «Ён будзе па-свойму асаблівым і стане такім, абсалютна такім, якім мы яго з вамі зробім», — перакананы Кіраўнік дзяржавы. Беларускаму народу пад сілу пераадолець усе цяжкасці. Галоўнае — не збаўляць хуткасць і не адхіляцца ад выбранага намі шляху.

Гэтыя словы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі прагучалі на прыёме ад імя Прэзідэнта напярэдадні старога Новага года. У святочныя дні краіна падводзіла вынікі і дзякавала тым, хто сваёй працай і дасягненнямі ўзбагаціў год мінулы.

Прэміі «За духоўнае адраджэнне», спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва і прэміі «Беларускі спартыўны Алімп» Прэзідэнт Беларусі ўручыў 9 студзеня. Цырымонія адбылася ў Палацы Рэспублікі. Там жа разгарнулася выстаўка-прэзентацыя дасягненняў і творчых прац лаўрэатаў.

Уручэнне прэміі «За духоўнае адраджэнне» — цудоўная традыцыя, якая надае калядным святам асаблівы сэнс, адзначыў Кіраўнік дзяржавы. «Вялікую ідэю служэння грамадству і дзяржаве наміканты прэміі ставяць вышэй за матэрыяльную выгаду, сваімі справамі і ўчынкамі ўмацоўваюць у нашых сэрцах веру ў дабро і чысціню сумлення», — перакананы Аляксандр Лукашэнка. Такі прыклад, падкрэсліў Прэзідэнт, выклікае пачуццё гонару за беларускі народ, які захаваў найлепшыя нацыянальныя рысы: спагадлівасць і велікадушнасць, працавітасць і мэтанакіраванасць, сапраўдны патрыятызм.

Працяг на стар. 2 ►

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 20002

«ЛіМ»-акцэнты

Бяспека. Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч падчас чарговага пасяджэння праекта «Экспертнае асяроддзе» — «*Deepfakes*: новы выклік інфармацыйнай бяспецы» ў прэс-цэнтры БелТА выказаўся за тое, каб унесці ў заканадаўства паняцці *fake i deepfake*. Міністр лічыць, што гэтую тэму ў кантэксце гарантавання інфармацыйнай бяспекі трэба абмяркоўваць з усімі зацікаўленымі ў парламенце. На думку Аляксандра Карлюкевіча, неабходна ацаніць маштабы з'явы, патэнцыяльныя пагрозы і падумаць, як выкласці гэта ў заканадаўчай базе. Ён выказаўся за тое, каб «ужо сёння рыхтаваць праекты, дзе будуць прапісаны такія паняцці, як *fake i deepfake*. «Людзям неабходна растлумачыць, да чаго гэта прывядзе. Трэба сказаць, што не прынята ў нас, што можа мець проціпраўны характар. Такім чынам будзе выказана пазіцыя не толькі дзяржавы, але і здаровай часткі грамадства», — падкрэсліў Аляксандр Карлюкевіч.

Супрацоўніцтва. Беларусь і Еўрапейскі саюз падпісалі пагадненне аб спрашчэнні выдачы віз і аб рэадмісіі асоб, якія знаходзяцца без дазволу, паведамляе БелТА. Пагадненне прадугледжвае ўзаемнае аблягчэнне візавых працэдур для шырокай катэгорыі грамадзян і зніжэнне збору. Пасля падпісання дакументы павінны быць ратыфікаваны Нацыянальным сходам Беларусі і адобраны Еўрапейскім парламентам. Паводле БелТА, яны пачнуць дзейнічаць у першы дзень другога месяца пасля даты паведамлення бакамі адзін аднаму аб завяршэнні працэдур ратыфікацыі. У пачатку лютага ўступіць у сілу абноўлены Візавы кодэкс Еўрапейскага саюза, які прадугледжвае павышэнне кошту візавага збору да 80 еўра. Для беларусаў гэта будзе дзейнічаць да таго часу, пакуль не ўступіць у сілу пагадненне з ЕС. Пасля гэтага збор аўтаматычна знізіцца да 35 еўра.

Падзея. IV Міжнародны фестываль дзіцяча-маладзёжнай творчасці і педагагічных інавацый «Кубак Беларусі па мастацкай творчасці — Асамблея мастацтваў» адкрыецца 20 студзеня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (Палац Рэспублікі). Гэта частка сусветнага мастацкага праекта *World Art Assembly*. Фестываль мае на мэце даць магчымасць адораным дзецям і падлеткам праявіць талент, прадставіць работы шырокай аўдыторыі, прафесійным мастакам-педагогам. Фестываль аб'ядноўвае выставачную, конкурсную і адукацыйную праграмы. Конкурсная праграма складаецца з такіх напрамкаў, як жывапіс, графіка, фатаграфія, скульптура, аўтарская лялька, дэкаратыўна-прыкладное, тэкстыльнае, лічбавае мастацтва. Цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў адбудзецца 1 лютага. Пасля заканчэння фестывалю будзе апублікаваны каталог «Новыя твары ў мастацтве» *(New Faces in Arts)*.

Юбілей. Брэсцкі абласны краязнаўчы музей арганізуе серыю выставак да свайго 70-годдзя. Першая экспазіцыя юбілейнага года — прысвячэнне праекту «12 артэфактаў», які быў прымеркаваны да тысячагоддзя Брэста. На працягу 2019 года былі выстаўлены найбольш рэдкія экспанаты з фондаў музея, кожны з іх дэманстраваўся на працягу тыдня. У падагульняльнай выстаўцы будуць сабраны ўсе 12 рэліквій, якія можна пабачыць з сярэдзіны студзеня да канца сакавіка. Па слядах этнаграфічных экспедыцый мяркуецца арганізаваць выстаўку прадметаў, датычных побыту і гаспадарчай дзейнасці, традыцый і абрадаў жыхароў Брэсцкай вобласці. Дэманстрацыя музейных калекцый запланавана на ліпень-верасень. У планах на канец года — маштабная выстаўка найбольш каштоўных экспанатаў, сабраных у фонды музея за 70 гадоў.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

Гонар і годнасць

Па выніках 2019 года прысуджаны пяць прэмій «За духоўнае адраджэнне». Імі адзначаны працоўныя калектывы і прадстаўнікі рэлігійных аб'яднанняў за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы.

Прэмія прысуджана настаяцелю прыхода храма святой роўнаапостальнай Марыі Магдаліны горада Мінска протаіерэю Іаану (Івану) Харашэвічу за значны ўклад ва ўмацаванне ідэй міласэрнасці і арганізацыю работы Дома духоўнай асветы.

Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў удастоена высокай узнагароды за актыўную гуманітарную дзейнасць па аказанні дапамогі ветэранам і ўвекавечанні памяці аб Вялікай Айчыннай вайне.

За вялікую работу па матэрыяльнай і маральнай падтрымцы шматдзетных сем'яў, рэалізацыю гуманітарных праектаў «Конкурс на найлепшую шматдзетную сям'ю», «Мінскі гарадскі форум маці», тэлепраекта «Родныя людзі» прэміяй адзначаны калектыў ГА «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў».

Прэміяй уганараваны калектыў філіяла ўстановы культуры «Брэсцкі абласны краязнаўчы музей» «Археалагічны музей «Бярэсце». Нагодай стала яго актыўная дзейнасць па захаванні нацыянальнага культурнага здабытку і стварэнне абноўленай экспазіцыі філіяла музея.

За стварэнне фундаментальнага картаграфічнага выдання «Вялікі гістарычны атлас Беларусі» прэміяй уганараваны аўтарскі калектыў у складзе акадэміка-сакратара аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандра Кавалені, галоўнага рэдактара РУП «Белкартаграфія» Галіны Ляхавай, дырэктара ДУ «Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі» Вячаслава Насевіча.

А вось яшчэ адна падстава для віншаванняў. За выдатныя дасягненні ў сферы прафесійнага мастацтва, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і патрыятычнага выхавання творчай моладзі, дабрачыннай дзейнасці, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысуджаны 10 спецыяльных прэмій Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва.

Калектыў установы культуры «Музей «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва» ўганараваны спецпрэміяй за стварэнне экспазіцыі Музея гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, а таксама правядзенне маштабных выставачных праектаў «Восіп Цадкін. Вяртанне», «Аляксандр Родчанка. Фатаграфія з «ВМАТЭМАЙС».

Аўтарскі калектыў у складзе намесніка загадчыка аддзела дырэкцыі інфармацыі ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Барыса Герстэна, дырэктара ПВУП «Майстэрня Уладзіміра Бокуна» Уладзіміра Бокуна, рэжысёра-пастаноўшчыка ПВУП «Майстэрня Уладзіміра Бокуна» Уладзіміра Луцкага адзначаны спецыяльнай прэміяй за стварэнне серыі дакументальных фільмаў «Хроніка Мінскага гета».

За вялікі ўнёсак у выхаванне творчай моладзі і рэалізацыю культурных праектаў «Міжнародны сімфанічны форум-конкурс маладых кампазітараў краін СНД імя М. К. Агінскага», «Масты дружбы: Беларусь — Расія», «Духоўная старонка малой радзімы» спецыяльнай прэміяй уганараваны заслужаны аматарскі калектыў Беларусі сімфанічны аркестр УА «Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М. К. Агінскага».

Высокай узнагародай адзначаны калектыў Брэсцкага гарадскога цэнтра культуры за выдатныя дасягненні ў развіцці аматарскай мастацкай творчасці, правядзенне маштабных мерапрыемстваў, прысвечаных 1000-годдзю горада Брэста, і рэалізацыю міждзяржаўнай праграмы «Брэст — культурная сталіца Садружнасці-2019».

Спецыяльнай прэміяй адзначаны і калектыў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь. Нагодай стала рэалізацыя творчых праектаў, якія пазітыўна прадстаўляюць нацыянальную культуру ў Беларусі і за мяжой, а таксама важкі ўнёсак у выхаванне творчай моладзі.

Спецпрэміяй уганараваны калектыў Іўеўскага цэнтра культуры і адпачынку за значны ўклад у развіццё народнай творчасці і рэалізацыю праекта «Іўеўскі каларыт».

Спецыяльная прэмія прысуджана аўтарскаму калектыву ў складзе народнага артыста Расіі Ігара Крутога, рэжысёра-пастаноўшчыка, заснавальніка кампаніі *Sechenov.com* Аляксея Сечанава, мастацкага кіраўніка прадзюсарскага цэнтра «Артмажор» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аляксандра Вавілава — за распрацоўку і рэалізацыю творчай канцэпцыі маштабных цырымоній адкрыцця і закрыцця II Еўрапейскіх гульняў 2019 года.

Высока ацэнены ўнёсак у патрыятычнае выхаванне моладзі, рэалізацыю культурных праектаў па фарміраванні экспазіцыі Музея гісторыі паветрана-дэсантных войскаў і спецназа імя В. П. Маргелава, а таксама правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных дзяржаўным святам і памятным датам, ваенна-патрыятычнага цэнтра спецыяльнай падрыхтоўкі для дапрызыўнай моладзі «Скіф».

Заслужаны аматарскі калектыў фальклорны ансамбль «Дударыкі» гімназіі нумар 14 горада Мінска адзначаны за выдатныя дасягненні ў галіне аматарскага мастацтва, паспяховае прадстаўленне Беларусі ў праграмах міжнароднага фестывалю «Гармонь збірае сяброў», Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу і іншых праектаў.

За мазаічнае афармленне алтарнай часткі храма-помніка ў гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, выратаванні Айчыны нашай паслужыўшых, спецыяльнай прэміяй уганараваны аўтарскі калектыў у складзе дацэнта кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Дзяніса Чубукова, майстра вытворчага навучання гэтай кафедры Кірыла Орсіка, індывідуальнага прадпрымальніка, члена Беларускага саюза мастакоў Аляўціны Башкатавай.

«Мы і ў далейшым будзем падтрымліваць і заахвочваць усіх, хто ўзбагачае культурную спадчыну Беларусі, беражэ маральныя і духоўныя арыенціры, адраджае і напаўняе новым сэнсам нацыянальныя традыцыі. Яны наш якар, які дапаможа ўтрымацца на хвалі глабалізацыі, нацэленай на разбурэнне дзяржаўных асноў», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Літаральна праз некалькі дзён на прыёме ад імя Прэзідэнта Беларусі напярэдадні старога Новага года адбылася цырымонія ўручэння дзяржаўных узнагарод, якімі адзначаны дзяржслужачыя, артысты і журналісты. Звяртаючыся да тых, хто быў запрошаны на ўрачыстасць, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што іх аўтарытэт і высокія вынікі з'яўляюцца яркім прыкладам для ўсяго грамадства.

Увогуле ж дзяржаўных узнагарод удастоены 96 прадстаўнікоў розных галін. Так, ордэнам Францыска Скарыны ўзнагароджаны дырэктар выдавецкага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мастацкая літаратура» Аляксандр Бадак, першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Святлана Копцева, член Беларускага саюза мастакоў Валерый Шкаруба. Заслугі работнікаў розных сфер адзначаны таксама медалямі і ганаровымі званнямі.

Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджана артыстка Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Валянціна Гарцуева. Дыплом аб прысваенні ганаровага звання «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь» уручаны артыстцы Купалаўскага тэатра Юліі Шпілеўскай. Дзяржузнагароды прысуджаны за шматгадовую плённую працу ў дзяржаўных органах, высокі прафесіяналізм, вялікі асабісты ўклад у развіццё і папулярызацыю беларускага тэатральнага мастацтва.

Прадстаўнікі СМІ ўдастоены Падзякі Прэзідэнта за высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у развіццё дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі. Сярод узнагароджаных — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» Вольга Мядзведзева, намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце БелТА Сяргей Адзярыха.

«З'яднанасць, наша любоў да Радзімы шматразова прымножаць нашы сілы для новых дасягненняў», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі, віншуючы з высокімі ўзнагародамі.

Інеса ПЕТРУСЕВІЧ

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Знутры вякоў

Думкамі наконт атрымання ганаровай прэміі падзялілася **загадчык археалагічнага музея «Бярэсце», філіяла Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея, Святлана ШЧЭРБА:**

— Перш за ўсё галоўны вектар нашай дзейнасці — захаванне традыцый: гэта закладзена ў самым падмурку музея. Дзякуючы даследаванням археолага Пятра Лысенкі ў 1982 г. Брэст як архітэктурная з'ява адшукаў свайго прапрародзіча і даў шанец так моцна наблізіцца да вытокаў горада, як яшчэ не ўдавалася ніколі. Асноўную цікавасць выклікаюць рэшткі дзядзінца старадаўняга Брэста. Паходжанне горада адносяць да XIII ст., а агульны аб'ём гістарычных знаходак, якія ўваходзяць у музейную экспазіцыю і фонды, складае каля 43 тысяч экспанатаў. Спецыяльна да тысячагоддзя горада ў музеі была праведзена сур'ёзная рэканструкцыя. Тое, што праца калектыву музея была адпаведным чынам ацэнена, — гэта падзея, якая абумоўлена шырокай запатрабаванасцю экспазіцыі. Жыццём старажытных берасцейцаў цікавяцца не толькі сённяшнія жыхары горада: вялікую папулярнасць музей мае сярод турыстаў з усёй постсавецкай, і не толькі, прасторы, якіх прыцягвае да нас магія гістарычна-побытавага адраджэння, аналагаў якой не знайсці ні ў адным горадзе Усходняй Еўропы.

У прыярытэце — адказнасць

З нагоды ўзнагароджвання ордэнам Францыска Скарыны **пісьменнік, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» АлесьБАДАК** паразважаў пра месца ўзнагарод у творчым (і не толькі) самаасэнсаванні пісьменніка:

— Не бяруся гаварыць за ўсіх пісьменнікаў у тым, што датычыцца стаўлення да узнагарод, але ў сваім жыцці ніколі не сустракаў аўтара, які б абсалютна абыякава ставіўся да таго, як ацэньваюць яго творчасць ці пазатворчую дзейнасць. Ордэн Францыска Скарыны стаў ацэнкай не толькі маёй прыватнай творчасці, але і працы выдавецтва «Мастацкая літаратура». А гэта вялікі калектыў і дастаткова вялікая колькасць аўтараў, прычым аўтараў, як я лічу, вельмі таленавітых, сучасных і запатрабаваных сённяшнім чытачом. І ў гэтым кантэксце такога кшталту ўзнагарода для мяне, безумоўна, вельмі важная і вельмі прыемная. У прынцыпе, калі атрымліваеш узнагароду, заўсёды хочацца, з аднаго боку, падсумаваць тое, што табою зроблена, азірнуцца назад, але, з іншага боку, хочацца глядзець наперад і ў нейкім сэнсе ўспрымаць гэта як аванс, інвестыцыю ў далейшую руплівую працу. Гэта натхняе, каб рабіць сваю працу яшчэ лепш, яшчэ цікавей, і ў той жа момант адчуваеш большую адказнасць, разумеючы, што такую высокую ўзнагароду, як ордэн, пісьменнікі і ўвогуле творчыя людзі атрымліваюць не часта. Хаця сёння кніжны рынак вельмі перанасычаны, а самы кароткі шлях да поспеху — гэта выдаваць бульварную літаратуру, я магу сказаць і як дырэктар, і, спадзяюся, як пісьменнік, што свядома іду шляхам іншым, больш складаным, бо з-пад абедзвюх маіх рук — пісьменніцкай і выдавецкай — у свет выходзяць не кнігі-аднадзёнкі, а нешта сапраўднае, што мае ўсе шанцы перажыць любыя крызісныя сітуацыі нашага часу.

Падрыхтаваў Данііл ЛЫСЕНКА

форумы

Краязнаўцы краіны, гуртуйцеся!

Пляцоўкай для правядзення I Рэспубліканскага краязнаўчага форуму ў другой палове лютага стане Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Арганізатары праекта яднання творчых сіл, якія займаюцца рознымі галінамі рэгіёназнаўства, — Міністэрства культуры і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Беларускі фонд культуры пры падтрымцы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Выдавецкага дома «Звязда».

Да ўдзелу ў форуме запрашаюцца краязнаўцы, супрацоўнікі ўстаноў культуры, адукацыі, навукі і культуры, айчынных масмедыя, студэнты ВНУ, настаўнікі і нават школьнікі. Мяркуецца, што ў межах шэрагу мерапрыемстваў удасца арганізаваць дэталёвае вывучэнне сучаснага стану краязнаўства, вызначыць перспектыўныя задачы і клопаты, якія найперш варта вырашыць у справе папулярызацыі гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны беларускіх гарадоў і вёсак, пашырыць веданне грамадства пра розныя краязнаўчыя праекты ў Беларусі. Важна стварыць пастаянна дзеючую пляцоўку для абмеркавання спраў у краязнаўчым асяроддзі, пашырыць магчымасці творчай самарэалізацыі моладзі ў даследаваннях роднай старонкі, развіць у школьнікаў патрыятычныя памкненні, нацыянальную самасвядомасць.

Адзін са складнікаў форуму — конкурс на найлепшае краязнаўчае выданне за 2017—2019 гады. Будуць праведзены прэзентацыі найбольш цікавых краязнаўчых праектаў. Пройдзе навукова-практычная канферэнцыя. Удзельнікі форуму змогуць пазнаёміцца і з выстаўкай краязнаўчай літаратуры, якую ладзіць Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

Сяргей ШЫЧКО

стасункі

Пад небам Даўгаўпілса

Творчы вечар сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі Станіслава Валодзькі адбыўся ў Цэнтры беларускай культуры горада Даўгаўпілс (Латвія).

Падчас імпрэзы можна было пачуць песні на словы Станіслава Валодзькі ў выкананні ансамбляў «Спадчына» і «Купалінка», якія дзейнічаюць пры ЦБК і таварыстве «Уздым», літоўскага спевака Сяргея Шабадалава, дуэта з латвійскага горада Ліваны Яўгена Пашкевіча і Лідзіі Знотыні, даўгаўпілскіх спевакоў Андрэя Парневіча, Вэлты Лоцэ, Рэгіны Родзікавай і Таццяны Багданавай. Музыку да гэтых песень напісалі Яўген Лівіцін, Альберт Белусь, Мікола Яцкоў, Анатоль Мядзведзеў, Эдуард Вартанаў, Дзмітрый Пятровіч, Александр Рудзь і Віктар Антонаў. Вершы Станіслава Валодзькі прагучалі ў выкананні сяброў «Уздыму» Галіны Сантоцкай, Валянціны Анікінай і Анастасіі Сазанковай.

У адрас творцы прагучала шмат шчырых слоў ад дырэктара Цэнтра беларускай культуры і старшыні «Уздыму» Жанны Раманоўскай, членаў праўлення «Уздыму» Іны Валюшкі і Таццяны Дзянісавай, сяброў Рускай пісьменніцкай арганізацыі Даўгаўпілса Паўла Плотнікава, Валянціны Прудзікавай, Яўціхія Канаплёва і інш. Станіславу Валодзьку ўручылі кнігу «Радуга жизни», выдадзеную Рускай пісьменніцкай арганізацыяй, дзе надрукаваны і яго вершы.

Сам жа герой імпрэзы падараваў ЦБК і таварыству «Уздым» свае кнігі на беларускай і рускай мовах «На гэтай зямлі» і «Под небом Родины», дзе надрукаваны яго вершы, навелы і п'еса, а таксама —

Станіслаў Валодзька.

складзены ім шосты па ліку зборнік песень даўгаўпілскіх аўтараў «Песенный город».

Алёна СВЕТЛАЯ

да ведама

Класіка як навінка

На пачатку года падведзены вынікі выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці за 2019 год. Падчас прэс-канферэнцыі ў прэс-цэнтры Дома прэсы адзначылі: 76 найменняў кніг агульным тыражом у 85 тысяч асобнікаў выйшла летась у выдавецтве «Мастацкая літаратура», 72 найменні кніг тыражом больш чым у 215 тысяч выпусціла «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», 65 найменняў накладам звыш 108 тысяч пабачылі свет у выдавецтве «Беларусь», 95 найменняў кніг і аўдыякнігі агульным тыражом амаль у 546 тысяч асобнікаў выпусціла «Вышэйшая школа». Агучаны таксама планы на 2020 год.

Кіраўнікі выдавецтваў падкрэсліваюць: традыцыйна высокая цікавасць чытачоў да беларускай класікі. Напрыклад, у «Мастацкай літаратуры» летась пабачыла свет серыя «Напісанае застаецца», у якой выйшлі дзве кнігі — зборнік аповесцяў Васіля Быкава і трылогія Якуба Коласа «На ростанях». На сёння іх у крамах амаль няма. Папулярнасцю карыстаецца і поўны збор твораў Уладзіміра Караткевіча, куды ўпершыню ўвайшлі яго малюнкі, шаржы і аўтапартрэты, ненадрукаваныя пры жыцці творы і інш. Апошнія тамы збору выйдуць сёлета, да 90-годдзя з дня нараджэння класіка.

Выдавецтва «Народная асвета» анансавала новыя школьныя падручнікі для старшых класаў (з тэхналогіяй дапоўненай рэальнасці і электроннымі дадаткамі для паглыбленага ўзроўню вывучэння прадметаў), а таксама першыя кнігі серыі «Тусоўка.by» для падлеткаў і «Шафа» для маленькіх чытачоў. «Беларусь» працягне праект «Падарожжа па родным краі». З'явяцца і два адмысловыя альбомы: першы прысвечаны работам знакамітага ювеліра Мікалая Кузьміча, другі — манументалісту Уладзіміру Зінкевічу. Сярод адметных праектаў «БелЭН» — энцыклапедыя, прысвечаная 1000-годдзю Брэста. Першы тыраж выдання разышоўся вельмі хутка, таму сёлета пабачыць свет дапоўненае і дапрацаванае.

«Кнігавыданне ў краіне на высокім узроўні. Пераканацца ў гэтым можа кожны наведвальнік Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу», — упэўнена кансультант упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Людміла Быкава. Са шматлікімі навінкамі айчынных выдавецтваў можна будзе азнаёміцца з 5 па 9 лютага ў выставачным павільёне на праспекце Пераможцаў, 14.

Яўгенія ШЫЦЬКА

зваротная сувязь

У эфіры

КАНАЛ "КУЛЬТУРА" БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ

У праграме «Кнігалюбу» на канале «Культура» Беларускага радыё ў суботу слухайце гутарку з пісьменнікамі Алесем Бадаком і Міхасём Пазняковым. У праграме «Запрашаем у кнігарню» ў нядзелю асобнае месца зойме расповед пра «ЛіМ». У «Літаратурнай анталогіі» з панядзелка да пятніцы Алег Вінярскі чытае «Мёртвыя душы» Гогаля, а ў «Радыёбібліятэцы» гучыць раман Кузьмы Чорнага «Зямля».

Праграма «Паэзія XXI стагоддзя» ў выхадныя прапануе вершы паэта Анатоля Зэкава. У суботнім эфіры ў межах праграмы «Радыётэатр. Лепшае» можна паслухаць радыёкампазіцыю «На ўсякага мудраца хапае прастаты» па п'есе Аляксандра Астроўскага. Госцем праграмы «Суразмоўцы» ў нядзелю будзе пісьменнік Віктар Праўдзін.

Аб аб'яўленні конкурсу

Установа адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад (да 5 гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу з далейшым заключэннем кантракта ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны Наймальнікам:

1	кафедра струнных смычковых інструментаў	старшы выкладчык (1,0 шт. адз.)
2	падрыхтоўчае аддзяленне	старшы выкладчык (1,0 шт. адз.)

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

***19 студзеня** — на пасяджэнне літаратурна-музычнага аб'яднання «Акорд» з удзелам Тамары Залескай у дзіцячую бібліятэку № 2 (15.00).*

***20 студзеня** — на сустрэчу з Міхасём Пазняковым у СШ № 86 (13.00).*

***21 студзеня** — на імпрэзу «Літаратура вялікага горада» з удзелам крытыка Людмілы Вараб'ёвай у бібліятэку № 21 (14.00).*

***22 студзеня** — на сустрэчу з Людмілай Воранавай у СШ № 19 (12.40).*

***22 студзеня** — на сустрэчу з Вольгай Норынай у літаратурны клуб «Шчырасць» пры бібліятэцы № 22 (16.00).*

***23 студзеня** — на творчы вечар Бажэны Мацюк «Самасць» у Мінскі гарадскі адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Лідар» (г. п. «Ждановічы») (15.00).*

Гродзенское абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***18 студзеня** — на чарговыя заняткі школы маленькага рэпарцёра з удзелам Іны Багданавай у СШ № 12 г. Гродна (11.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***23 студзеня** — на Таццяніны вячоркі «Імя і лёс» з удзелам пісьменнікаў у дзіцячую бібліятэку-філіял № 9 г. Магілёва (16.00).*

***24 студзеня** — на ўрок патрыятызму «Незабыты подзвіг: піянер-герой Марат Казлоў» з удзелам Міколы Леўчанкі ў бібліятэку (г. Быхаў, м-н Колас, д. 82) (14.00).*

***24 студзеня** — на сустрэчу са Святланай Шкумаевай «І вырастуць крылы» (г. Касцюковічы, вул. Зеньковіча, д. 28) (11.00).*

***24 студзеня** — на сустрэчу з Аляксандрам Балдоўскім «Жывое слова пісьменніка» ў Крычаўскі раённы цэнтр культуры (11.00).*

«ЛіМ»-люстэрка

У другім пекінскім універсітэце замежных моў адбылося адкрыццё помніка народнаму паэту Беларусі Янку Купалу, паведамілі ў Пасольстве Беларусі ў Кітаі. Ва ўрачыстасці бралі ўдзел пасол Беларусі ў КНР Кірыл Руды, аўтар помніка — дырэктар Мастацкага музея Кітая скульптар У Вэйшань, рэктарат універсітэта, прадстаўнікі дзяржорганаў Кітая, паслы замежных дзяржаў, кіраўніцтва Сакратарыята Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, журналісты кітайскіх СМІ. Імпрэза прайшла ў межах завяршэння Года адукацыі Беларусі ў Кітаі. Адкрыццё помніка Янку Купалу — падзея, якая сведчыць аб шчырай цікавасці і павазе кітайскага народа да беларускай гісторыі і культуры, адзначаюць у дыпмісіі. Помнікі беларускім пісьменнікам ёсць і ў іншых гарадах Кітая — Якубу Коласу ў Цяньцзіні і Янку Купалу ў Сіяні.

Французская газета *Le Figaro* уключыла Беларусь у дваццатку турыстычных напрамкаў, якія вандроўнікам варта адкрыць у 2020 годзе. «Мы маглі б назваць яе «Спящая красавица Европы», — піша *Le Figaro* пра нашу краіну. Газета распавядае, што Беларусь з'яўляецца радзімай Марка Шагала, адзначае архітэктурнае багацце Мінска, а таксама дзіўную прыроду. *Le Figaro* заўважае, што Беларусь адкрыта для турызму, у тым ліку дзякуючы ўвядзенню бязвізавага рэжыму для жыхароў многіх краін. У топ-20 напрамкаў гэтага года выданнем *Le Figaro* таксама уключаныя Аўстралія, Мадагаскар, Інданэзія, ААЭ, Славенія, Грузія, Куба, Японія, Гаваі і іншыя.

Дыск да 100-годдзя з дня нараджэння Мечыслава Вайнберга, музыку якога выконвае Міжнародны камерны аркестр *East-West Chamber Orchestra* пад кіраўніцтвам Расціслава Крымера, высока ацэнены ў Еўропе. Рэцэнзія выйшла ў студзеньскім нумары аўтарытэтнага англійскага штомесячнага часопіса аб класічнай музыцы *Gramophone*, паведамляе БелТА. «Для мяне таксама вельмі важна, што ўпершыню дзякуючы дыску ў розных краінах свету згадваецца Беларусь і Мінск у жыцці кампазітара, — адзначае Расціслаў Крымер. — Бо менавіта Мінск стаў у 1939 годзе для кампазітара прыстанкам у час халакосту». Дыск да 100-годдзя Мечыслава Вайнберга, у рабоце над якім узялі ўдзел найлепшыя музыканты з розных краін свету, быў выдадзены ў мінулым годзе кампаніяй *Naxos*. Прэзентацыя адбылася ў час XIV Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета.

Міжнародны выставачны праект «Украіна з любоўю» (г. Днепр) прадстаўлены ў Карцінай галерэі Гаўрылы Вашчанкі ў Гомелі. Гэтым разам наведвальнікам прапануюць работы майстра Любові Каваленкі — мастака, ілюстратара, пераможцы ўсеўкраінскага фестывалю, майстра пясочнай анімацыі, дырэктара творчага цэнтра «Краіна талентаў». Любоў Каваленка таксама выкладае і дапамагае асвоіць такія кірункі, як лепка з гліны, жывапіс, батык, кропкавая размалёўка. Галерэя рэгулярна знаёміць жыхароў і гасцей горада з творчасцю ўкраінскіх мастакоў. Былі прадстаўлены калекцыя работ Чарнігаўскага абласнога мастацкага музея, выстаўка ўдзельнікаў міжнароднага пленэра «Дняпроўскі паром», карціны, прысвечаныя 30-годдзю чарнобыльскай трагедыі і іншыя. На творчай пляцоўцы таксама праводзяцца выстаўкі аўтараў з Расіі, Францыі, Кітая, Румыніі, Індыі, Японіі, Польшчы і іншых краін. З творамі Любові Каваленкі можна азнаёміцца да 9 лютага.

Журналісты з выдання *We Got This Covered* даведаліся, што стваральнікі фільмаў аб Гары Потэру пакажуць у працягу фэнтэзі. Чакаецца, што сюжэт новай карціны будзе заснаваны на гісторыі, якая адбудзецца праз 20 гадоў. Вялікая частка арыгінальнага акцёрскага складу вернецца, будзе дададзена некалькі сюжэтных ліній. Адным з цэнтральных персанажаў карціны стане дачка Волан-дэ-Морта, якая паспрабуе ўваскрасіць бацьку-злыдня. Да таго ж фільм пакладзе пачатак серыялу, сюжэт якога засяродзіцца на малодшым сыне Гары Потэра, які ўпершыню з'явіўся ў эпілогу другой часткі «Дарункаў смерці». Не выключаецца, што сцэнарыстам выступіць брытанская пісьменніца Джоан Роўлінг, паведамляе РІА «Новости».

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

Жарты ад Яўгеніі

Я веру у студэнцкую планету,
У свой маленькі казачны сусвет,
Дзе па начах гарачыя санеты
Цытуе ўзрушаны паэт.
(з чарнавікоў)

Мы ведаем Яўгенію Янішчыц як лірыка, значна менш — як паэта-сатырыка, паэта-гумарыста. На свяце, якое ладзілася 20 лістапада 2018 года ў Літаратурным музеі Яўгеніі Янішчыц з нагоды 70-годдзя паэтэсы і 20-годдзя музея, Любоў Мікалаеўна Алізарэвіч (дачка Ліды Саўчук, якой Жэня прысвяціла верш) падчас выступлення паведаміла, што ў яе захоўваўся блакнот Жэні, і прачытала некалькі эпіграм з яго.

Студэнцкіх гадоў блакнот перада мною. Першая вокладка не захавалася. На апошняй — штамп Добрушскай папяровай фабрыкі «Герой труда». Дата выпуску 4.VII.1966 г.

Блакнот укладзены ў новую вокладку, на першай старонцы якой назва «*Gedichte von Erich Weinert*» і малюнак, на якім нямецкі паэт-трыбун чытае свае вершы перад натоўпам. На апошняй старонцы — інфармацыя на нямецкай мове аб Эрыху Вайнерце (1890—1953). На ўнутраным баку вокладкі — дарчы надпіс: «На память моей русской подруге Евгении. Твоя немецкая подруга Марлис. Ена, в мае 1970». У 1970 годзе ў складзе ўніверсітэцкай дэлегацыі Жэня была ў Ене.

Пачатак блакнота пашкоджаны. Але чытаюцца прозвішчы, ёсць нумарацыя. Адсутнічаюць лісты і эпіграмы пад № 1, 9, 12. На каго ж яны пісаліся? Вядома, што на сяброў-паэтаў. Аб гэтым блакноце пагаварыла з Аленай Руцкай, бо там значыцца і яе імя. Алена згадала, што на занятках аб'яднання «Узлёт» Алег Лойка вёў з імі гаворку аб эпіграмах. І прапанаваў паспрабаваць свае сілы ў гэтым жанры. Наколькі ёй помніцца, абмеркаванне тэмы было шумным. А калі прагучала знакамітая эпіграма, у якой адлюстраваны канфлікт паэтаў Еўтушэнкі і Далматоўскага: «Ты — Евгений, я — Евгений. Я — не гений, ты — не гений…», то ўласныя ўжо ніхто не чытаў. Алене падалося, што Жэня памкнулася агучыць свае эпіграмы, але па нейкай прычыне не зрабіла гэтага. І пасля аб эпіграмах гаворка не заходзіла.

Тады Жэня напісала эпіграмы на Лену Руцкую (№ 2), Віктара Яраца (№ 3), Яўгена Хвалея (№ 4), Сашу Разанава (№ 5), Генадзя Пашкова (№ 6), Лёву Барташа (№ 7), Уладзіміра Дзюбу (№ 8,), Анатоля Казловіча (№ 10), але яны не захаваліся, толькі ў некаторых — па некалькі слоў ці радкоў. Напрыклад, на Дзюбу:

О, час настаў. Бяру вяроўку,
Каб зацугляць XX век.

Поўнасцю захаваліся эпіграмы на Эдуарда Зубрыцкага (№ 11), Еўдакію Лось (№ 13):

Прывыкла я да слоў харошых,
Кашу касою, сею лён.
Але ў сезон апошні грошы
Мяне ўцягнулі, што ў палон.

О, маладосць мая! Куды ты
Пайшла з абдымкаў дарагіх —
Не смейце біць мяне капытам,
Таму што пакажу рагі.

На Веру Вярбу (№ 14):

О, колькі суму і пакутаў
Ў сваёй душы адна нашу.
На дзень ірву па 20 путаў
І зноў, свавольніца, грашу.

Каторы раз, адкрыўшы дзверы,
Ты мне паверыш ці не
паверыш?..
О, буду рада я без меры,
Калі ты зноў паверыш Веры.

На Міколу Федзюковіча (№ 15), Сяргея Панізніка (№ 16):

Заўжды з пяром напагатове.
Чаго хачу, таго даб'юсь.
Хоць зараз я твару у Львове,
Але да костак беларус.

На Бічэль-Загнетаву (№ 17), Міхася Губернатарава (№ 18), Сяргея Законнікава (№ 19):

Што я паэт — мазгі на плаху.
Хваліцца вельмі не люблю.
Любога класіка з размаху
Я «Сценькай Разіным» звалю.

На Анатоля Сербантовіча (№ 20), Аўгінню Кавалюк (№ 21), Анатоля Канапельку (№ 22), Валеру Лапату (№ 23), Дзюбу II (№ 24). Не абмінула паэтэса і сябе, але нумар не паставіла:

Пяю, як птушка. Не змаўкаю
Я пра каханне і пра сум.
На Беларусь усю гукаю
Пра маладосць і пра красу.

У гэтым жа блакноце без нумара два вершы на рускай мове нейкаму адрасату з ініцыяламі Л.М., магчыма, А.М., бо чарніла расплылося. Высветліць імя адрасата пакуль што не атрымалася. Вось гэтыя вершы.

Если б был ты один у меня,
Я тебя бы любила здорово.
А теперь только я одна
По чужому блуждаю городу.
Говорю деревьям «люблю»
И, присев перед ними на корточки,
Я снежок голубой ловлю,
Что примёрз до последней косточки.
***
Мог заметить. И мог не встретить.
Мог найтись и мог потеряться.
Ломит руки деревьям ветер,
А они не хотят сдаваться.

Если где-то бушует ветер,
Если где-то не видно ни зги.
Ты возьми осторожно ветки,
Будто руки мои возьми.

Сярод эпіграм, паэтычных радкоў кшталту: «Падобна першая сустрэча / На светлы міг, на дзіўны сон», сустракаецца і скланенне лацінскіх назоўнікаў. Гэта дае нам падставу аднесці запісы да 1966, 1967 гг., таму што на філфаку лацінскую мову вывучаюць на першым курсе.

Вельмі ўражвае тэкст, запісаны алоўкам: «*Настрой дзікі. Ніколі не было так сумна. Кожны дзень са мной адбываецца небывалае ЧП. Дзіўна. Хочацца бясконца плакаць, хочацца падысці да самага блізкага чалавека і працягнуць сваю руку. Але блізкага чалавека няма. Пэўна, і не будзе.*

Ізноў успамінаецца мама».

На некалькіх старонках, у тым ліку на апошняй, чарнавыя запісы верша «Я веру у студэнцкую планету…», які так і не атрымаў завершанага варыянта. Можа, таму, што Жэні сапраўды хацелася верыць «у студэнцкую планету», якую называла «казачным сусветам», але не вельмі атрымлівалася, бо сапраўдны творца заўсёды адзінокі.

Вокладка блакнота Яўгеніі Янішчыц, у які яна запісвала эпіграмы.

Дарэчы, у роднай школе ведалі, што Жэня любіла жарты. Аб гэтым успамінае Альфонс Іосіфавіч Гагалінскі, намеснік дырэктара Парэцкай сярэдняй школы, настаўнік гісторыі: «У той час, калі вучылася Жэня Янішчыц, настаўнікі мелі такое грамадскае даручэнне, як агітатар. Агітатары былі і асветнікамі, і інфарматарамі, і выхавальнікамі. Усе калгасныя справы адлюстроўваліся ў "Баявых лістках". Жэня нам у гэтым вельмі дапамагала. <…> Яе вершы, асабліва сатырычныя, карысталіся вялікім поспехам». Аб вартасці тых вершаў гаварыць у нас няма падставы, таму што «Баявыя лісткі» не захаваліся.

Не захаваліся і гумарыстычныя вершы, якія Жэня пісала для свайго брата па маці Міхаіла Янішчыца. Міхаіл быў чалавекам артыстычным і з задавальненнем чытаў вершы сястры ў вясковым клубе і ў час адпачынку ад працы.

У школьныя і студэнцкія гады Жэня прымала актыўны ўдзел у выпуску насценных газет, дзе таксама змяшчала жартоўныя вершыкі. На лекцыях і на нудных сходах яна, як шкадлівае дзіця, магла напісаць некалькі трапных радкоў і пусціць па аўдыторыі, а сама гарэзліва пасміхалася, назіраючы за рэакцыяй сяброў. Такія экспромты не захоўвала.

Жэня была вострай на язык, з добрым пачуццём гумару. У нашым інтэрнацкім пакоі яна часта дэкламавала вершы, празаічныя творы на палескай гаворцы, як правіла, гумарыстычныя. Найчасцей гучала гумарэска, як муж пісаў сваёй жонцы Хіўры тэлеграму, якая пачыналася словамі: «Дорагая Хіўря, Бычкі продаў удачно…». Сёння мне цяжка сказаць, чые гэта былі творы — яе ці народныя.

Думаю, што да жанру пародыі Жэня ставілася як да забавы, таму і не пакідала для сябе копій. Але гэта было яе аддушынай, прымірэннем з наваколлем, у якім яна пачувалася няўтульна, бо часта яе істотаю авалодваў меланхалічны настрой.

Няма сэнсу шкадаваць аб тым, што не захавалася, але варта помніць, што Яўгенія Янішчыц была і гарэзлівай, і вясёлай.

Эпіграмы і вершы з блакнота ўключаны ў трэці том выдання: «Яўгенія Янішчыц: творы, жыццяпіс, каментары». Блакнот перададзены ў Літаратурны музей Яўгеніі Янішчыц.

Тамара АЎСЯННІКАВА

Найлепшыя анекдоты — з жыцця

Не пацешышся, дык павесішся, — здаўна кажуць у народзе. Гумар заўжды ратаваў, дапамагаў спраўляцца з цяжкасцямі, афарбоўваў штодзённасць у святлейшыя колеры і настроі. Ёсць нават навуковая выснова пра тое, што вясёлыя людзі, схільныя да жартаў ды ахвочыя пасмяяцца, даўжэй жывуць. Гумар бывае да месца і тады, калі нельга на сур'ёзнае адказаць яшчэ больш сур'ёзным і тым самым драматызаваць сітуацыю... «Несур'ёзна пра сур'ёзнае» — назва кніжнай серыі, заснаванай выдавецтвам «Чатыры чвэрці» ў 2014 годзе. У ёй пабачылі свет 24 зборнікі вершаў, пародый, жартаў, смешных карацелек, гумарыстычных гісторый і сцэнак. І гэта не завяршэнне — працяг плануецца.

Само выдавецтва існуе ўжо 25 гадоў. А гісторыю заснавання «смешнай» серыі згадала дырэктар установы Ліліяны Анцух:

— Працуючы з сур'ёзнымі аўтарамі, часта заўважала: якімі ж яны бываюць гумарыстамі! Жартуюць, бы тыя хлапчукі. Таму і з'явілася ідэя аб выданні жартоўных твораў. Згадалі мастака Валянціна Губарава, вядомага ва ўсім свеце карцінамі з адметнымі вясёлымі сюжэтамі. Звярнуліся да яго з прапановай папулярызаваць і яго творчасць. З тых часоў ён дорыць выдавецтву выявы, а кожны з аўтараў, які выдаецца ў серыі, абірае малюнкі, што найбольш адпавядаюць настрою яго твораў. Яны трапляюць на вокладку і старонкі кніжкі.

На ўрачыстасці, прысвечанай пяцігоддзю серыі, многія аўтары чыталі пародыі, распавядалі пра тое, што падштурхнула да напісання твораў, дзяліліся смешнымі гісторыямі, якія адбыліся з імі альбо іх сябрамі (а потым і паслужылі сюжэтамі для напісання гумарыстычных твораў). Узаемаадносіны паміж блізкімі людзьмі, суседзямі, калегамі па працы, сцэны непаразумення ў рэстаране, лякарні, школе, рэдакцыі — нагоду пасмяяцца можна знайсці паўсюль. Часам гэта няправільна пачутае слова альбо не так зразуметы сэнс выказвання, памылковыя высновы і вынік дзеянняў, пабудаваных на няправільных абгрунтаваннях. І праўда ў тым, што найлепшыя анекдоты не прыдумляюць, а бяруць з жыцця.

Фота Марыны Вярбіцкай.

Чамусьці ў літаратуры гумар не лічыцца сур'ёзным жанрам (мусіць, з прычыны сваёй прыроды). І часта самі пісьменнікі, якія любяць пажартаваць у зносінах з сябрамі і знаёмымі, пішуць толькі пра сур'ёзнае і сур'ёзна... Але смех і гумар — найлепшы сродак падняць настрой і натхніць на штосьці вартае!

Яна БУДОВІЧ

БРАТ САСНЫ І ПРАЎДЫ СЫН

Калі «візітоўкай» успрымання малой радзімы Якуба Коласа з'яўляецца прызнанне, што прагучала ў паэме «Новая зямля» (*Мой родны кут, як ты мне мілы!.. // Забыць цябе не маю сілы!*), то ў Міколы Аўрамчыка кранаюць сэрца такія радкі:

Мая Бабруйшчына зялёная,
Здаешся іншым ты малой
З тваёй Бярэзінай хвалёнаю
І з непрыкметнаю Алой.
А мне заўсёды паўнаводнымі
Здаваліся іх берагі,
Былі твае мясціны роднымі,
Куток з маленства дарагі.

Верш так і называецца — «Мая Бабруйшчына зялёная». На Бабруйшчыне, у вёсцы Плёсы, ён нарадзіўся 14 студзеня 1920 года. Як сведчыць у аўтабіяграфіі «Пра сябе», любоў да літаратуры яму прывіла настаўніца Алена Лаўрэнаўна Меляшкевіч: «Дзякуючы ёй горача палюбіў апавяданні і аповесці Якуба Коласа і Кузьмы Чорнага, вершы Янкі Купалы і Максіма Багдановіча». Гэта падахвоціла і самога пісаць вершы. Адзін з іх, прысвечаны Якубу Коласу, прачытаў увосень 1936 года на вечары ў бабруйскім Доме Чырвонай Арміі. У горадзе якраз шырока адзначалася 30-годдзе літаратурнай дзейнасці песняра. Тады ж упершыню ўбачыў Канстанціна Міхайлавіча і Платона Галавача, які выступіў з дакладам пра творчасць класіка.

Будучы дзесяцікласнікам, рэгулярна прапаноўваў свае творы ў насценную газету, а ў канцы 1937 года дэбютаваў у бабруйскай акруговай газеце «Камуніст». Праз год яго верш «Парашутыстка» быў надрукаваны ў другім нумары часопіса «Полымя рэвалюцыі». Да юнага аўтара ўважліва ставіліся Кузьма Чорны, Аркадзь Куляшоў, Рыгор Мурашка. На яго творы давалі «вельмі падрабязныя і змястоўныя пісьмовыя адказы». А ўлетку 1938 года, пасля заканчэння сярэдняй школы, Міколу запрасілі на рэспубліканскія курсы маладых аўтараў. Восенню ж паступіў на літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага.

Студэнты выпускалі часопіс «Наша творчасць», ладзілі творчыя сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі. На адну з іх прыйшлі Янка Купала, Якуб Колас, Міхась Лынькоў, Эдзі Агняцвет. Канстанціну Міхайлавічу спадабаўся верш М. Аўрамчыка «Адлёт жураўлёў». Свае ўражанні ён не толькі выказаў перад прысутнымі, але і пакінуў на верш пахвальны водгук у кнізе запісаў.

У 1938—1940 гадах М. Аўрамчык апублікаваў яшчэ некалькі вершаў: у тым жа «Полымі рэвалюцыі», у газетах «Звязда», «Літаратура і мастацтва», «Камунар Магілёўшчыны». У суаўтарстве з Аляксеем Коршакам прарэцэнзаваў дзве кнігі. Пасля гэтых выступленняў у друку наступіў доўгі перапынак, да 1946 года. Яго імя з літаратуры на нейкі час выкрасліла Вялікая Айчынная вайна. Гвардыі радавы М. Аўрамчык апынуўся на Волхаўскім фронце.

Ва ўзводзе славутых «Кацюш» ваяваў нядоўга. У канцы чэрвеня таго ж сорак другога пры акружэнні каля Мяснога Бору трапіў у палон. З гэтага моманту і пачалася яго, кажучы словамі Рыгора Барадуліна, «трагічная, ахвярная біяграфія». Вывезлі на каменнавугальную шахту горада Марль. Пра перажытае расказваў так: «Кожны дзень на дасвецці з лагера да шахты канваіры прыганялі вялікую калону з палонных, абвітую гірляндамі шахцёрскіх лямпаў. Нявольнікаў апускалі ў падзямелле. У лагеры лупцавалі кіямі паліцаі, па дарозе да шахты штурхалі прыкладамі канваіры, а ў падзямеллі кайлом білі штайгеры і іх памочнікі».

Фота Кастуся Дробава.

Як сведчанне — верш «Сустрэча былых канагонаў» (у шахтах канагонам называюць паганятага каня, запрэжанага ў ваганетку):

Паўзмрочная капальня ў дымным Руры,
І ў ёй не я, а сноўдае штодзень
Шкілет, які яшчэ абцягнут скурай,
Ды на сцяне — чужы, сутулы цень.

Твор напісаны пасля вайны ўжо. Пасля таго, як Мікола Якаўлевіч пабываў у Салігорску. Разам з шахцёрамі спускаўся і ў забой. Працаваць у шахце яму было не прывыкаць, бо шахцёрам быў не толькі ў Руры, а і ў Данбасе, пасля Перамогі.

Верш гэты даў назву яго аднайменнай кнізе лірыкі, якая пабачыла свет у 1963 годзе і адзначана Літаратурнай прэміяй імя Янкі Купалы ў 1964-м. Першая ж кніга паэзіі М. Аўрамчыка «Пярэдні край» выйшла ў 1949 годзе. За ёю з'явіліся зборнікі «Шляхамі дружбы» (1952), «Ключы жураўліныя» (1960). Пасля «Сустрэчы былых канагонаў» пабачылі свет кнігі «Універсітэцкі гарадок» (1967), «Агледзіны» (1969), «Як на далоні» (1970), «Дрэва дружбы» (1973), «Вадовішча» (1976). Тройчы выходзілі выбраныя творы, прытым у 1980 годзе ў двух тамах. Выдаў Мікола Якаўлевіч і зборнік вершаў для дзяцей «Дружба» (1950). Шмат займаўся перакладамі. Яго творы таксама перастворaны на некалькі моў.

_Ва ўспамінах М. Аўрамчыка ёсць яшчэ і такая важная якасць, як фактаграфічная насычанасць. Прыгадваецца толькі тое, сведкам чаго быў сам. Пасля гэтага хочацца працытаваць Рыгора Барадуліна, які засведчыў: «Пра шчодрасць душы, пра жаданне падзяліцца ўсім самым дарагім сведчаць шматлікія прысвячэнні, па якіх, як і па вершах паэта, можна чытаць геаграфію і біяграфію».__

Зведанае, перажытае ў гады Вялікай Айчыннай вайны ніколі не адпускала ад сябе — у пасляваенных вершах нязменна прысутнічае гэтая тэма. Сярод іх вылучаецца верш «Каб гэтакага лёсу вы не мелі…». Радкі прасякнуты болем. Але гэта не толькі ўласны боль, але і ўсіх, каго таксама напаткаў незайздросны лёс:

Пад Чудавым я цудам не забіты.
Прапаў без вестак я
ў Мясным Бары,
І ў Руры, Богам і людзьмі забыты,
Ледзь выбраўся з падземнае нары.
Чужою славай радавым
не ласавацца…
Але мне крыўдна ўсё ж,
што пакрысе
У мове прыжылося слова ўласаўцы,
Джалільцы ж слова
ведаюць не ўсе.

Муса Джаліль — татарскі паэт, палітрук, які мужна трымаўся ў фашысцкім палоне:

Вярнуўшы добрае імя старое,
Закона справядлівая рука
Уваскрасіла з мёртвых, як героя,
Былога нашага паліпрука.

Манера пісьма ў М. Аўрамчыка знешне спакойная, але ўражанне гэтае падманлівае. Ёсць у яго вершах і такая важная якасць, як прыхаваны драматызм, што сведчыць аб неўтаймаванасці душы лірычнага героя, яго не толькі чыста чалавечым, а і грамадзянскім неспакоі, які асабліва дае аб сабе знаць тады, калі ўнутраная энергія радка просіцца вонкі, прагне споведзі.

Паспрабаваў Мікола Якаўлевіч свае сілы і ў прозе, напісаўшы раман «У падзямеллі» і аповесць «Палон», праўдзіва расказаўшы пра зведанае ў гады Другой сусветнай вайны. Найперш праз вобразы галоўных герояў Янкі Лагуна і Міхася Сіліча. Абодва персанажы з яркімі аўтабіяграфічнымі рысамі. Праўда вайны ў творы — тая, якая доўга замоўчвалася. Каларытнымі атрымаліся вобразы каменданта лагера Грышкі і паліцая Гаўрыка. Ва ўсім сваім мярзотным вобліку паўстаюць наглядчык Ляўшун і даносчык Румега. Ім супрацьстаяць тыя, хто і ў пякельных умовах захаваў чалавечнасць. Гэта прадстаўнікі розных нацыянальнасцей, але ім аднолькава невыносна цяжка. Яны трымаюцца. Дый іншых, слабейшых духам, падтрымліваюць. Фашыстаў пісьменнік паказаў не толькі чорнымі фарбамі. Сярод іх таксама былі тыя, хто ваеннапалонных успрымаў людзьмі, па меры магчымасці падтрымліваў, як мог аблягчаў іх становішча. Некаторыя з іх выведзены пад сваімі сапраўднымі прозвішчамі, а гэта таксама сведчыць на карысць таго, што М. Аўрамчык імкнуўся быць як мага больш праўдзівым. Мастацкая праўда не засланяла яму праўды жыццёвай. Біяграфія самога апавядальніка — толькі частка таго фактычнага матэрыялу. Ён пісаў пра тых, на чыю долю выпалі нечалавечыя выпрабаванні, звязаныя з ваеннымі дзеяннямі і з жахам палону, няволі.

Важкія набыткі Міколы Якаўлевіча і ў галіне мемуарыстыкі. У кнізе «Знаёмыя постаці» змешчаны аповеды пра пісьменнікаў, з якімі ў той ці іншы час звёў лёс. Аднак аўтар нязменна прытрымліваўся падыходу: расказваць толькі пра творцаў, якіх ужо з намі няма.

Пра тых, хто адышоў у лепшы свет, ён паведаў па-свойму, па-аўрамчыкаўску: цёпла, светла, пранікнёна, з павагай, захапленнем талентам кожнага, каго згадвае. Са старонак кнігі паўстаюць незабыўныя абліччы Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Анатоля Грачанікава, Кандрата Крапівы, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Аляксея Пысіна і іншых. Але асабліва шчымлівыя радкі прысвяціў ён Аляксею Коршаку і Міколу Сурначову, сябрам свайго даваеннага юнацтва.

Ва ўспамінах М. Аўрамчыка ёсць яшчэ і такая важная якасць, як фактаграфічная насычанасць. Прыгадваецца толькі тое, сведкам чаго быў сам. Пасля гэтага хочацца працытаваць Рыгора Барадуліна, які засведчыў: «Пра шчодрасць душы, пра жаданне падзяліцца ўсім самым дарагім сведчаць шматлікія прысвячэнні, па якіх, як і па вершах паэта, можна чытаць геаграфію і біяграфію».

Да месца і сказанае Алегам Лойкам, які з удзячнасцю зазначыў, што М. Аўрамчык — «адзін з першых настаўнікаў паэтычнай моладзі Беларусі з пачатку 50-х і аж да 80-х гг.». Гавару «адзін з першых», бо не забываюся пра Анатоля Сцяпанавіча Вялюгіна ў «Полымі», Сяргея Сцяпанавіча Дзяргая — у «Вожыку». Алег Антонавіч быў упэўнены, што «[…] яны былі трыма зоркамі, былі святлістым Арыёнам, бляск якога спадаў на кожнага з нас — шасцідзесятнікаў, сямідзесятнікаў». Пра тых, перад кім адкрыў вялікі свет літаратуры, сам Мікола Якаўлевіч шчыра, ад сэрца сказаў у 1977 годзе ў вершы «Паэтам "Маладосці"»: «Вас усіх я добра помню ў твар, // Ведаю любога з вас пайменна».

У аўтабіяграфіі ён прыгадаў вядомае выказванне: «Кажуць, што біяграфія паэта — у яго вершах» і развіў гэтую думку: «Мабыць, кароткая ў мяне біяграфія, бо вершаў напісаў я вельмі мала». Сапраўды

Манера пісьма ў М. Аўрамчыка знешне спакойная, але ўражанне гэтае падманлівае. Ёсць у яго вершах і такая важная якасць, як прыхаваны драматызм, што сведчыць аб неўтаймаванасці душы лірычнага героя, яго не толькі чыста чалавечым, а і грамадзянскім неспакоі, які асабліва дае аб сабе знаць тады, калі ўнутраная энергія радка просіцца вонкі, прагне споведзі.

так, калі мець на ўвазе колькасць. Ды колькасць далёка не заўсёды сведчыць пра якасць.

Як ні згадаць меркаванне Пімена Панчанкі? Асабліва яму падабаўся твор М. Аўрамчыка «Беларуская сасна»: «У многіх паэтаў ёсць адзін верш, у якім нібы сканцэнтравана ўся сутнасць і асаблівасць іх паэзіі. У М. Святлова гэта "Гранада", у Я. Смелякова — "Калі я захварэю…", у С. Арлова — "Яго зарылі ў шар зямны" і г. д. У М. Аўрамчыка такім вершам я назваў бы "Беларускую сасну"… Тут усё хораша: і думка, і сюжэт, і вобразнасць. Адразу адчуваеш і гордасць за сваю працу лірычнага героя, і любоў да роднай Беларусі з баравымі соснамі. Але галоўнае — верыш шчыраму даверліваму голасу паэта. У гэтым увесь Аўрамчык з яго яснай паэзіяй, з любоўю да радзімы, да людзей працы, з вернасцю франтавому сяброўству…»

Дзвюма строфамі з гэтага твора, у якім прачытваецца частка суровай і трывожнай біяграфіі выдатнага паэта, і хочацца закончыць згадкі пра яго:

З кожнай штольні пахне беларускай,
Баравой, смалістаю сасной…
Пад зямлёй праход нязручны, вузкі
Выглядае просекай лясной.
Ты з настойлівасцю вугаль колеш,
Іскры пырскаюць з-пад малатка…
Родная сасна пад цяжкай столлю
Не аддасць у крыўду земляка.

Мікола Аўрамчык — брат сасны і сын праўды. Пакручасты быў ягоны лёс, неаднойчы набліжаў на валасок да смерці. Ды, бадай, самім Усявышнім яму было наканавана выжыць. А жыў не толькі за сябе, а і за сяброў. За Аляксея Коршака, Міколу Сурначова, якія рана пайшлі з жыцця. Ён жа ўсё набліжаўся да 100-гадовага рубяжа. Адышоў у вечнасць 8 мая 2017 года.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Уласнымі ключамі

Уцяжкай, з усіх бакоў абмеркаванай, але так і недаабмеркаванай тэме *разумення паэзіі* ёсць і такое спрэчнае пытанне: ці варта аўтару тлумачыць, што ён меў на ўвазе, раскрываць сутнасць вобразаў, ды і ўвогуле разжоўваць чытачам сэнс твора? Яно непазбежна ўсплывае тады, калі з'яўляецца кніга паэзіі, дапоўненая раздзелам «каментары», у якім не слоўнік свамовы, не даведка па гістарычных падзеях і не эксперымент кшталту «Уліса» (чамусьці перанесенага ў вершы). Хаця не. У выпадку са смелым паэтычным творам, які б узяўся паўтараць джойсаўскія эксперыменты, пытанне ўзнікла б таксама.

Так ці інакш, кніга паэзіі, дапоўненая раздзелам «каментары», у нас ёсць. Гэта леташні зборнік «лірыкі з каментарамі» Алеся Бадака «Развітанне з вечнасцю». Аўтар твораў, якія хаваюцца пад мінімалістычна аформленай срэбнай вокладкай, вядомы і дасведчаны. Складана ўявіць, што яму магло б не ставаць кантакту і камунікацыі з чытачом. Таму ёсць меркаванне, што каментары нясуць больш глыбокую функцыю ў структуры кнігі. Але да іх пазней. Найперш ідуць самі вершы, так што да іх і звернемся.

Вершы, змешчаныя ў кнізе, з большага раскрываюць звыклыя для паэзіі тэмы, пададзеныя з нязвыклай пазіцыі, якую можна атаясамліваць калі не з жыццёвай філасофіяй аўтара, то хаця б з яго творчым метадам. Сутнасць у тым, што любоў да Радзімы, прырода, сям'я, «пытанне паэта і паэзіі» і так далей раскрываюцца ў вершах праз прызму прасторы і часу. Аўтар стварае вершы як ключы ад сусветных законаў: ён добрасумленны грамадзянін свету і хоча не зламаць іх, не перагарнуць ці перарабіць (што даволі часта сустракаецца ў літаратараў), а адкрыць і зразумець, прычым так, як людзі адмыкаюць дзверы ў свой дом — сваімі ключамі. Калі пазбавіцца лішніх метафар, можна сказаць, што аўтар, прынамсі, у прасторы сваіх тэкстаў, імкнецца да гармоніі з сусветам. Паэт не кідаецца на чытача са складанай метафорыкай і не абрынае на яго галаву цяжкія форменныя канструкцыі, яго мова простая і зразумелая. Яна не мае ні пышнай вычварнасці, ні наўмыснай мудрагелістасці, і ў дадзеным выпадку вершы ад гэтага толькі выйграюць.

У маленстве я жыў адчуваннем цябе,
І здаваўся мне час бесклапотна-
бяспечным.
На падворку трава, на страсе верабей, —
Уяўлялася ўсё на зямлі гэтай вечным.

Усё, што апісваецца ў вершах Алеся Бадака, з'яўляецца часткай звычайнага, звыклага чытачам свету. «Паэтызацыя» яго адбываецца цалкам за кошт аўтарскага ўяўлення і светаўспрымання. Тэкст — паслядоўнасць элементаў рэчаіснасці — выстройваецца такім чынам, што атрымліваецца верш. Яго метад нагадвае імкненне паказаць звыклыя рэчы з нязвыклага ракурсу. Аўтар карыстаецца простымі сілаба-танічнымі памерамі, даволі простымі рыфмамі, і тэксты не тое каб нешта губляюць праз гэта, але часам застаецца адчуванне, што афармленая такім чынам паслядоўнасць элементаў рэчаіснасці прачытваецца менш натуральна, узмацняецца адчуванне зробленасці паэтычнага тэксту. У верлібрах, да якіх А. Бадак звяртаецца не так часта, гэтая зробленасць знікае, аўтарская думка адчуває сябе больш вольна і, адпаведна, раскрываецца ў нечым цікавей. Можна нават сказаць, што афармленае «ў рыфму» — часцей тое, што перад вачыма аўтара; верлібрычнае — часцей тое, што ў свядомасці.

Але даволі часта згаданае пра рыфмаваныя вершы А. Бадака абсалютна апраўдваецца, бо тэкст пачынае выклікаць асацыяцыі з фальклорам за кошт скарыстанай аўтарам рытмікі або рэфрэнаў. Зразумела, што гэта робіцца свядома. Такім чынам аўтар зноў выяўляе сувязь сваёй творчасці з традыцыямі. Да таго ж разгорнутыя ў тэкстах тэмы і пошукі вельмі ўдала стасуюцца з каляфальклорнай формай. Часта ў тэкстах узнікаюць вобразы дарогі, зямлі. Алесь Бадак увогуле любіць звяртацца да пейзажных замалёвак, але заўважнае адрозненне ад шэрагу іншых аўтараў заключаецца ў тым, што ў яго прырода ніколі не выкарыстоўваецца для ўпрыгожвання. Ды і ў цэлым, ніводзін верш не напісаны проста, каб быць напісаным. Напэўна, аўтару самому вырашаць, добрая гэта характарыстыка ці не.

Яшчэ адно назіранне, якое пацвярджае і думку пра агульную накіраванасць творчых пошукаў паэта, і здагадку пра зварот да традыцыйных форм, — гэта частае ўзнікненне ў вершах дэкарацый, памежнага стану: паміж сапраўдным і ўяўным, рэальнасцю і міфалагічным.

Калі прыгледзецца, то ўся кніга — гэта расповед пра блуканне ў памежжы: святло — цемра, жыццё — смерць, каханне — адзінота, мінулае — сёння. Гэтыя сусветныя арэлі дуалізму адбіваюцца і на форме. Асабліва часта такія вершы можна заўважыць у трэцяй і апошняй паэтычнай частцы кнігі, якая і называецца адназначна: «Край свету».



Усё меней і меней
тут лета.
Усё болей і болей тут суму.
І цягнуцца ноччу ад ветру
Дрэвы мокрыя бліжэй
да ЦУМа.
Ім здаецца, што там,
ля вітрынаў,
У цяпле за празрыстай сцяною
Зноў з'яўляюцца шэрыя спіны
Іх сясцёр і братоў.

«Развітанне з вечнасцю» падзяляецца на чатыры часткі: тры паэтычныя і каментары.

Аўтар стварае вершы як ключы ад сусветных законаў: ён добрасумленны грамадзянін свету і хоча не зламаць іх, не перагарнуць ці перарабіць (што даволі часта сустракаецца ў літаратараў), а адкрыць і зразумець, прычым так, як людзі адмыкаюць дзверы ў свой дом — сваімі ключамі.

Каментары — гэта своеасаблівыя эсэ, у якіх аўтар распавядае не тое каб пра гісторыю стварэння верша, а пра яго карані — разважанні і падзеі, якія так ці інакш прывялі да стварэння тэксту. Так, напрыклад, да верша «Камяні» прыкладаецца вялікі нарыс пра родную вёску аўтара. А да перакладу верша «Вёска. Заважанне» — эсэ пра пераклад паэзіі. Такія допісы суправаджаюць не кожны тэкст: для значнай колькасці твораў у каментарах пазначана толькі сціплае «напісаны ў ... годзе». Гэта пацвярджае думку пра тое, што аўтар стварыў каментарную частку не для таго, каб нешта патлумачыць у саміх тэкстах. Падаецца, што да кожнай канкрэтнай гісторыі яна будзе асобнай: дзесьці, магчыма, занадта вялікая эмацыянальная нагрузка, калі, напісаўшы верш, аўтар не здолеў пазбавіцца цяжару; дзесьці кантэкст сапраўды моцна дапамагае глыбей адчуць верш. Часам такія тэксты дэманструюць амаль цалкам аўтаномныя ад верша разважанні, звязаныя, напрыклад, з абставінамі напісання або лёсам верша. Нездарма яны ахарактарызаваны ў гэтым тэксце як эсэ — некаторыя з «каментароў» з'яўляюцца асобнымі творамі. Адметны тэкст, які суправаджае верш «Сусветная гісторыя». У ім аўтар шмат разважае пра сутнасць паэзіі і асабліва пра тое, што не мае дачынення да паэзіі.

Сярод паэтычных асаблівую ўвагу на сябе звяртае другая частка — яна носіць назву «Стаць лістападам (гісторыя аднаго кахання)». Слова «гісторыя», заяўленае ў назве, не варта ўспрымаць як намёк на сюжэтную структуру часткі. Гэта сапраўды гісторыя, але ў ёй распавядаецца пра пачуцці, а не пра падзеі, як у непаслядоўна выбудаванай хроніцы. Насамрэч з гэтых вершаў чытач няшмат даведаецца пра стасункі аўтара з жанчынай, якой і прысвечана гісторыя кахання, але адчуе галоўнае — глыбіню пачуцця з усімі яго адценнямі: наіўнасць, надрыў, горыч, хваляванне і пяшчота. Дзесьці можна прасачыць градацыю гэтых адценняў, развіццё пачуццяў. Дзесьці вершы зліваюцца ў суцэльную эмацыянальную плынь, у якой цяжка вылучыць нейкія этапы. У выпадку з вершамі пра каханне каментары выконваюць сваю функцыю найлепш. Яны не проста разбаўляюць эмацыянальны згустак кантэкстам, але і паглыбляюць змест гэтых эмоцый, афарбоўваюць іх яшчэ ярчэй, даюць ім глебу. У гэтым выпадку часткі з апавяданнямі-ўспамінамі і вершаваная зліваюцца ў адзін узаемадапаўняльны непадзельны твор.

Нягледзячы на тое, што «Стаць лістападам» можа існаваць як аўтаномны твор, ён упісваецца ў агульную карціну «Развітання з вечнасцю» за кошт экзістэнцыяльнага падтэксту. Як было згадана раней, уся кніга — хронікі блуканняў паміж крайнасцямі з празрыста акрэсленымі мэтамі. А што да каментароў — пакуль яны служаць для паглыблення кантэксту, а не спрашчэння чытацкага ўспрымання, то ніякай перашкоды не створаць. Чытач зможа інтэрпрэтаваць так, як яму будзе зручна, але так ці інакш міжволі далучыцца да аўтарскіх пошукаў.

Дар'я СМІРНОВА

з рэдакцыйнай пошты

З пазіцыі актыўнага чытача

Добры дзень, мая любімая газета «Літаратура і мастацтва»! Вельмі рада штотыднёвай сустрэчы з табой. Кожны нумар мы чытаем сям'ёй: мужу чытаю ўголас прозу і паэтычныя творы, сыну — цікавыя факты з жыцця малавядомых паэтаў і празаікаў. Ёсць творы, якія прымушаюць нас плакаць, а некаторыя выклікаюць абурэнне і нязгоду. Думаецца: няўжо гэта можа стаць прадметам мастацтва?

Вельмі ўзрадавалася, калі сутыкнулася з рубрыкай «ЛІМБ». Таму хачу выступіць з пазіцыі актыўнага чытача, на якога і разлічвае паэт, калі піша свае вершы. З гэтай нагоды вырашыла прайсціся па вершах Ігара Пракаповіча, ды не проста пагартаць, а «прачытаць з алоўкам».

Дакрануцца да паэзіі — гэта справа, як мне здаецца, вельмі складаная, бо важна не пакрыўдзіць творцу, не нашкодзіць яму суб'ектыўным поглядам, але разабрацца ў душы лірычнага героя і нешта адкрыць для сябе.

Паэт Ігар Пракаповіч прыходзіць да высновы, што трэба быць «бліжэй да Бога, Сонца і цяпла», і асабіста я не магу не пагадзіцца з такімі разважаннямі аўтара. Думаецца, што не на пачатку жыццёвай дарогі стаіць ён, упэўнены, што вось зараз жыццё здзівіць яго сваімі радасцямі. За плячыма «вялікі стос нязрушаных праблем», а значыць, ёсць жыццёвы вопыт, побач з якім фарміруецца і жыццёвая мудрасць. Што дапаможа ў такі няпросты час? Бог, малітва.

«Вось таму каля святынь // У цябе прашу: // "Божа мілы, не пакінь // Ты маю душу"».

Кранае верш «Хутар за рэчкай». У яго аснове — трагічная для старэнькага чалавека падзея — пярэбары ў горад да сына. Аўтар не звяртаецца да гарадскога пейзажу, погляд яго накіраваны на «адзінокі хутар», дзе «печка ў хаціне без полымя стыне. // Воўк па дварышчы спакойна гуляў». Сэрца баліць ад такога яскравага малюнка адзіноты і пустэчы. Неразвітыя сказы, шматкроп'і, паўторы спрыяюць кінематаграфічнай дакладнасці — столькі за імі душэўнага болю і сумненняў.

Холад пасяліўся ў хаце, дзе некалі было цёпла і ўтульна, дзе шумелі дзеці, адзначалі святы, маліліся. Мне чамусьці здаецца, што такі хутар ёсць і ў кожнага з нас і што бяда гэта агульная. Ці нешта ў нашым жыцці пайшло не так? Ці надоўга (альбо назаўсёды) адзінота і пустэча пасяліліся ў нашых вёсках? Хто ў гэтым вінаваты і як знайсці выхад?

Што датычыцца рытмікі, аўтар карыстаецца чатырохстопным ямбам, харэем, дактылем, таму ад паэтычнага слова вее павольнасцю, разважлівасцю і спакоем. Аднак рытмічныя націскі ў вершах часта мяняюцца, што надае ім лёгкасць і адчуванне палёту:

«Да новых высяў! // Без жыццёвых схем // Без трафарэтаў, без сустрэч // пустэчы».

Аўтар не быў арыгінальны, калі пісаў пра каханне: восень, лісты, пачуцці, шчасце, цеплыня. Гукавая арганізацыя радкоў, дзе асноўную ролю бяруць на сябе свісцячыя і шыпячыя, была парушана, на мой погляд, недарэчным у гэтым кантэксце словам «суздром» ('зусім, цалкам'). Не ўражвае і дзеяслоўная рыфма верша.

Апошні радок верша «Першы марозік і шэрань на дрэвах» штучна дапоўнены службовымі часцінамі мовы, што парушае пейзажны малюнак твора.

Падсумоўваючы напісанае, хочацца сказаць, што вершы Ігара Пракаповіча дастаткова цікавыя, сапраўды хутчэй традыцыйныя (і я не лічу гэта за недахоп), а ў іх аўтара ёсць свой адметны почырк і глыбокія думкі. З цікавасцю чакаю ад аўтара новых цікавых твораў.

Святлана КАМПАНЕЕЦ

Праз люстэрка пераходнай эпохі

Сучасны беларускі літаратурны працэс развіваецца ў спецыфічных умовах складанай, супярэчлівай, дынамічнай грамадска-культурнай эпохі, якая паставіла перад грамадствам цэлы шэраг сур'ёзных задач і праблем, што патрабуюць глыбокага асэнсавання і мастацка-творчага ўвасаблення. Жыццёвая і культурная прастора, у якую трапіў постсавецкі чалавек, шмат у чым нагадвала... вялізны супермаркет, дзе прадаюцца і купляюцца пачуцці, ідэі, перакананні, прынцыпы, таленты.

Таму экзістэнцыянальная мастацкая рэфлексія на сучаснасць для сённяшніх беларускіх празаікаў стала шмат у чым вызначальнай, мэйнстрымнай праявай іх творчасці. Айчынныя пісьменнікі з асаблівай цікаўнасцю і насцярогай пачалі ўглядацца ў прастору будзённага жыцця новага тыпу героя-персанажа. Асаблівую адметнасць і плённасць за апошнія два дзесяцігоддзі ў раскрыцці характару і псіхалогіі паводзін сучаснага чалавека набыла творчасць арыгінальнага беларускага празаіка Юрыя Станкевіча. За гэты перыяд ён стварыў некалькі раманаў, цэлую нізку аповесцей, а таксама вялікую колькасць апавяданняў.

Трэба адзначыць, што першы поспех і вядомасць Ю. Станкевічу прынесла аповесць «Луп», якая выйшла ў аднайменным зборніку, апублікаваным у бібліятэчцы часопіса «Маладосць» у 1989 годзе. Назва паходзіць ад лацінскага «*lupus*», што азначае «воўк». І сапраўды, галоўным героем аповесці становіцца трохгадовы прыручаны селянінам Карнюшкам воўк. Падаецца, што назва як бы незнарок скіроўвала чытача да спазнання выразна зададзенай аўтарам галоўнай ідэі: ці праўда тое, што ў наш час «чалавек чалавеку — воўк»? Ю. Станкевіч збірае амаль усіх вызначальных персанажаў твора ў адным месцы — на гарадскім птушыным рынку канца 80-х гадоў XX стагоддзя — тым гіпнатызавальным месцы, што стала сімвалам часу гарбачоўскай перабудовы, пунктам перасячэння розных людскіх інтарэсаў, турбот і перакананняў. Як слушна сцвярджае адзін з персанажаў аповесці, рынак — «гэта мадэль чалавецтва. Тут людзі на розны густ і ўсе жывёлы з Ноева каўчэга». Пісьменнік знарок тыпізуе многія вобразы персанажаў твора, называючы іх проста: Мастак, Акцёр, Філосаф, Студэнт, Мешчанін. Аўтар імкнецца падкрэсліць вельмі дробную ролю, якая адведзена прадстаўнікам творчых прафесій. Ды і самі прадстаўнікі мастацка-навуковай інтэлігенцыі пачуваюць сябе вельмі заклапочана і няўтульна ў новых рэаліях жыцця.

У апавяданні «Мільярд удараў» сімвалічна-наглядна пададзены галоўны нерв канфлікту сучаснасці праз насычаную мастацка-вобразную сістэму. Празаік раскрывае найбольш вызначальныя экзістэнцыяльна-пачуццёвыя дамінанты існавання чалавека пачатку XXI стагоддзя — адчуванне пакінутасці, адзіноцтва, павышаную трывожнасць ва ўспрыманні рэчаіснасці. Вобраз-сімвал ліфта як цывілізацыйна-тэхнічнага дасягнення ўдала падкрэслівае ўсю хісткасць і ненадзейнасць тэхналагічнага прагрэсу. І толькі ў памежнай сітуацыі герой выразна адчувае ўсю марнасць пражытых гадоў. Мільярд удараў сэрца становяцца паказальным сімвалам бездухоўнага жыцця, блізкага да жывёльнага існавання.

У аповесці «Пераход» Ю. Станкевіч знаёміць з галоўным героем — саракапяцігадовым армейскім афіцэрам Антонам Лашкевічам, якому дактары паставілі дыягназ смяротнай заразнай хваробы лепры. Жыццё нядаўна паспяховага маладога мужчыны набывае зусім іншы экзістэнцыяльны сэнс: «…Шмат перадумаўшы, чалавек па імені Антон Лашкевіч прыняў рашэнне з'ехаць у зону адчужэння…» Назва аповесці ўтрымлівае ў сабе галоўную ідэйную і светапоглядную сутнасць твора, яго эстэтычна-мастацкую зададзенасць у вырашэнні галоўнага пытання існавання чалавека на зямлі. І адказвае на вызначальнае пытанне: «Ці можа выйсці герой у пэўны момант жыцця з прасторы ранейшай закасцянелай і зараз ужо зоны турбулентнага жыцця?..» Стан *пераходу* і ёсць рух да выхаду чалавека з крызіснага стану існавання ў свеце.

Аўтар цвёрда прытрымліваецца той думкі, што чалавек ва ўсе часы павінен заставацца такой асобай, якая хоць і не выбірае гістарычныя эпохі свайго пражывання, але ў рамках любой з іх можа і павінна самастойна выбраць уласны шлях. Па вялікім рахунку, у цэнтр мастацкай канцэпцыі пісьменніка пастаўлена экзістэнцыяльнае светаадчуванне.

На прыкладзе творчасці Ю. Станкевіча мы можам назіраць выразную схільнасць да пабудовы міфалагемнай мастацкай карціны свету. Так, у аповесці «Апладненне ёлупа» пісьменнік стварае трафарэтны, ідэйна заангажаваны сюжэтны канфлікт паміж сістэмай і асобай. Галоўным героем твора становіцца інжынер-канструктар Янка Ласкоў, сын рэпрэсіраванага. Зведаўшы ўсе нягоды жыцця абмежаванага ў правах члена сям'і ворага народа, наш герой затаіў вялікую крыўду на палітычны лад грамадства, у якім яму даводзіцца выжываць. Страх, які ўвесь час скоўвае жыццё галоўнага героя, бо ён вымушаны штохвілінна хаваць сваю сапраўдную біяграфію, шчырасць душэўных пачуццяў, адкрытасць чалавечых адносін... Яго думкі, перажыванні, паводзіны пад уздзеяннем парушанай псіхікі неадольна скіраваны на пошук негатыўнага. Герой хваравіта апанаваны ідэяй-фікс — помсты за адабранае шчаслівае дзяцінства, за загубленую сям'ю, за скалечанае жыццё. І калі надараецца выпадак адпомсціць, ён з задавальненнем бярэцца за справу. Ласкова, як таленавітага інжынера-будаўніка, прыцягваюць да сакрэтнай працы па ўзвядзенні ў Маскве будынка-хмарачоса, які павінен быў сімвалізаваць грандыёзнасць, велічнасць і моц новага ладу. Яго канкрэтны ўдзел у будаўніцтве заключаўся ў тым, каб спраектаваць і практычна разлічыць вяршынны шпіль гмаха. Азнаёміўшыся з праектнымі данымі, герой жахаецца ад таго, колькі цэменту і бетону неабходна будзе патраціць на ўзвядзенне статуі. Доўгі час адпрацаваўшы інжынерам-праекціроўшчыкам на многіх будоўлях па ўсёй краіне, Янка ўвачавідкі бачыў гаротны стан жыцця народа, быў сведкам няўтульнасці барачнага жылля. Несправядлівасць і абсурднасць такога стану рэчаў аказваюць канчатковы ўплыў на рашэнне Ласкова зрабіць у разліках такую незаўважную падтасоўку, пры якой велічная постаць правадыра-істукана не зможа доўга ўтрымацца і рухне.



Фота Кастуся Дробава.

Ствараючы псіхалагічна замкнёны вобраз героя, які амаль не кантактуе з іншымі, а толькі жыве светам рыгарыстычнага ўнутранага жыцця, аўтар падкрэслівае звужанасць светапоглядных пазіцый і сухасць эмацыянальных адносін, што наглядна пацвярджаецца нават ва ўзаемадзеянні Янкі з самым блізкім яму чалавекам, з якім ён болей за ўсё кантактаваў падчас будоўлі, — каханкай-паварыхай Надзяй.

Трэба адзначыць, што сюжэтна-фабульны факт будаўніцтва гіганцкага дома з фігурай правадыра мае рэальную гістарычную аснову. Па загадзе Сталіна на месцы разбуранага ў 30-я гады храма Хрыста Выратавальніка планавалася ўзвесці менавіта такі хмарачос, які сімвалізаваў бы сабой магутнасць і веліч краіны Саветаў. Толькі падзеі Вялікай Айчыннай вайны перашкодзілі ажыццяўленню гэтай задумы.

Пісьменнік не верыць у прыроду лёгкага вырашэння праблемы змагання і барацьбы з таталітарнай сістэмай падаўлення чалавечай свабоды. Аўтар сумняваецца ў тым, што адчайным змаганнем герояў-адзіночак яе можна перамагчы і разбурыць. У гэтым аспекце знакавым падаецца культавы раман пісьменніка «Любіць ноч — права пацукоў», у якім галоўны герой Даніла Прусак паказвае прыклад барацьбы змагара-адзіночкі супраць чужынцаў-прыхадняў, гатоўнасць ахвяраваць усім, у тым ліку і жыццём, каб абараніць самае дарагое.

У пераходныя моманты гісторыі з іх крызіснымі кропкамі біфуркацыйных перамен выразна актывізуюцца і актуалізуюцца эстэтычныя, этычныя і мастацкія ідэі і задачы па вышукванні аптымальных парадыгм для выхаду з цывілізацыйных крызісаў. Творчасць Ю. Станкевіча яскрава дэманструе аўтарскія мастацкія практыкі, скіраваныя на пошукі крэатыўна-крытычнага пераасэнсавання пануючага культурна-аксіялагічнага коду нацыі.

Ігар ШАЛАДОНАЎ

Антыўтопія чалавечых мараў

Сафія Ворса — маладая аўтарка, зацікаўленая рознымі сацыяльнымі пытаннямі, у тым ліку пытаннямі інклюзіўнасці. Яна стварыла ўжо дзве кнігі прозы для падлеткаў — «Дзесяць простых гісторый» і «Горад аслеплых скрыжаляў». Цяпер пісьменніца рашылася на новы эксперымент і дэбютавала як драматург — яе п'еса «Дзень настаўніка» выйшла ў 2019 годзе ў выдавецтве «Альціёра Фортэ» і складаецца з прадмовы аўтаркі, водгука доктара педагагічных навук Мікалая Яленскага і аўтарскіх рэкамендацый да пастаноўкі. Усе элементы прадубліраваных і на беларускай мове, пераклад зроблены Зояй Падліпскай.

Цэнтральная тэма твора — чалавек і чалавечыя адносіны ў часы высокіх тэхналогій. Сафія Ворса паказвае школу будучыні, пераносіць дзеянне ў 2130-я гады. Як адзначае сама аўтарка, яе мэтай было паказаць, што ва ўсе часы для педагога галоўнае — бачыць у дзіцяці асобу, як і тое, што вучобу і кар'еру нельга ставіць вышэй за мары, любоў, сяброўства і міласэрнасць. Абстаноўка далёкай будучыні ў творы моцна нагадвае сучаснасць, але з лёгкімі элементамі антыўтопіі — дзеці ў аднолькавых шэрых касцюмах не размаўляюць на перапынках і глядзяць у адну кропку. Галоўная гераіня — настаўніца рускай мовы і літаратуры — вырашае выратаваць дзяцей, раскрыць ім вочы на радасць жыцця. Асноўны канфлікт твора — паміж гераіняй і сістэмай, якой яна мусіць падпарадкоўвацца. Але ўсе сутычкі з гэтай сістэмай адбываюцца быццам па-за сцэнай, кульмінацыйны момант пакідае непаразуменне. Сюжэт крыху наіўны, юнацкі, ён наўпрост перадае ідэі аўтаркі. Яна імкнецца раскрыць як мага больш сацыяльных праблем і выбірае ў якасці інструмента лісты і сачыненні, якія чытаюць, а пасля пішуць свае і зачытваюць персанажы-вучні. Праз іх паказваюцца такія знаёмыя нашаму часу праблемы, як здрада і подласць, развод бацькоў, стаўленне да людзей з інваліднасцю... Гісторыі вельмі эмацыянальныя і добра падыходзяць для ўвасаблення на сцэне. Магчыма, іх будзе цікава распавесці падлеткам, якія і павінны выконваць гэтыя ролі. У анатацыі пазначана, што п'еса створана для школьнага тэатра, але натхніла на пастаноўку дзіцячы тэатр-студыю «Тэатр без межаў» — сацыяльны праект актрысы Кацярыны Саковіч, дзе дзеці з прыёмных сем'яў і дзіцячых дамоў сямейнага тыпу засвойваюць акцёрскае майстэрства пад наглядам прафесійных тэатральных дзеячаў.

Здаецца, у п'есы значна больш шансаў зачапіць сваю мэтавую аўдыторыю — падлеткаў сярэднятага і старэйшага школьнага ўзросту і ўвогуле раскрыцца на сцэне, чым на паперы. Аўтарка тэксту і сама ўскладае вялікія спадзяванні на пастаноўку. Пра гэта сведчаць прыведзеныя ў канцы тэксту «аўтарскія рэкамендацыі да пастаноўкі». У іх пісьменніца поўнасцю перадае тэкст у рукі рэжысёра, дазваляючы яму змяняць колькасць персанажаў, прапісваць іх характары, змяняць фокус праблематыкі і перапісваць фінал, а таксама прапаноўваць свае трактоўкі падзеі, якая звязвае першую і другую часткі тэксту. У самой п'есе гэтая падзея не прапісана: яна адбываецца па-за сцэнай, і персанажы згадваюць яе толькі намёкамі. Такі давер да рэжысёра паказвае імкненне аўтаркі зрабіць гэты праект сапраўды супольным з кожным, хто возьмецца яго ўвасабляць. Але ж у кожнага можа быць сваё бачанне найбольш актуальных для грамадства праблем...

Такім чынам, «Тэатр без межаў» узяўся за рэалізацыю праекта Сафіі Ворсы, прэм'ера спектакля запланавана на вясну. Хто ведае, якім паўстане «Дзень настаўніка» ў сваім натуральным асяроддзі — на сцэне. Хутчэй за ўсё, ён захавае юнацкую ўзнёсласць і галоўныя ідэі, закладзеныя аўтаркай, бо менавіта яе імкненне растлумачыць усяму свету, што стасункі і мары — галоўнае ў жыцці, і з'яўляецца падмуркам твора.

Дар'я СМІРНОВА

Міхась БАШЛАКОЎ

ДЗЕЛЯ ПЕСНІ ВЫСОКАЙ

***

Коціцца міма клубок мітусні —
Ані свабоднай хвіліны…
Коцяцца следам стамлёныя дні,
Коцяцца снежнай лавінай…

Што было ўчора — успомніш яшчэ,
А што раней — не згадаеш…
Чорная цемра бяссонных начэй
З прагнасцю ўсё паглынае…

Мары, жаданні?..
Даўно за імглой…
Як зіхацелі вясёлкай!..
І не пазнаеш — старэчай журбой
Твары маршчыняцца горка…

Дзе вы цяпер, мае лепшыя дні?..
Выйду да гаю — гукаю…
А мне насустрач з глухой даліны
Вецер завею звіває…

Коціцца сутані шэры сувой…
Дзень за пагоркамі кануў…
І паміж хмар па-над снежнай смугой
Месячык тонкі праглянуў…

***

Вагаюся: куды мне зноў паехаць?..
На Пціч, дзе травы росамі звіняць,
Дзе вечарамі буду я блукаць,
Шукаць радкі, як даўнішняе рэха?..

Ці мо ў Крыжоўку, дзе за сонным гаем
Бясконцыя жытнёвыя палі?..
Гукну з пагорка — на краі зямлі,
Здаецца, мяне нехта аклікае…

А гэта значыць, рэха ці радкі
Мне адгукнуцца ў далі вечаровай —
І запішу я стоеныя словы,
Нягучныя, але як на вякі…

Што можа быць на свеце прыгажэй,
Як гэтая дарога ў жытнім полі,
І далеч, што туманіцца паволі,
Пад зорным зззяннем чэрвеньскіх начэй?..

Няспешна крочу: думак розных рой,
Як вечныя штодзённыя турботы…
І ціша над прасторай палявой,
І хараство дзівоснай адзіноты…

***

На Пціч прыеду — ціха пасяджу
Над заваддзю, дзе лебедзі дзівосныя,
На сонца, што заходзіць, пагляджу…
І будуць думкі мне прыходзіць розныя…

Ад спеваў птушак глохнуць лазнякі,
А я, дзівак, і днямі ў гэтым Мінску
Прыдумваю, запісваю радкі,
Што ўжо даўно не з сельскаю прапіскай…

Як хораша на лавачцы сядзець,
Глядзець, як далеч тоне у сутонні,
Як месячык азначыцца ледзь-ледзь
Над лугам, дзе стрыножаныя коні…

Ці гэта не паэзія сама?..
Запісвай толькі срэбраныя словы…
І сцелецца над рэчкаю туман,
Над шляхам і над часам вечаровым…

***

Бяжыць далёка ціхая дарога.
І каласіцца залаты авёс.
Складзецца што?..
На тое воля Бога…
Якую песню мне падорыць лёс?..

Люблю блукаць вячэрнімі шляхамі,
Калі звіняць над полем жаўрукі.
І лёгкі ветрык шэпча над аўсамі
Натхнёныя і светлыя радкі…

Я падхаплю матыў той вечаровы
І песню я таксама напішу —
І будуць потым стоеныя словы
Кранаць чыюсь счарсцвелую душу…

І крочу я і з горыччу гадаю:
Каму патрэбны ўсё мае радкі?..
Але нястомна гэтак жа спяваю,
Як гэтыя над полем жаўрукі…

***

Усё ідзеш, ідзеш
І словы ўсё шукаеш,
Бы ў суцемках блукаеш,
Спяваеш-ладзіш верш…
Не знаеш, што знайшоў…
Усё — як таямніца…
Грыміць — як навальніца,
А потым — ціша зноў…

Ні гуку, хоць ты плач,
І нават ні намёку…
А тут яшчэ і спёка…
Мой крытык, ты адзнач,

Што гэта — не гульня:
Шуканне розных тропаў…
Ускочыў на каня —
І скачаш ты галопам…

Пачуцці не суняць,
Эмоцыі — наросхрыст…
Не вершыкі складаць
Паводле свайго росту…

То музыка душы,
Што, як віхор, зрывае,
Паводкаю змывае —
Ні бруду, ні іржы…

Такая чысціня —
Як сонечнае ранне,
Як рос крышталёвых зззянне…
Над шляхам — цішыня…

Паэзія — абвал…
Імгненне — і падзенне,
То зноў — дзевяты вал,
І зноў душы ўзвышэнне…

***

Які радок напішацца,
Не знаеш…
З надзеяй крочыш…
Плешчацца прыбой…
І слухаеш,
Як хвалі набягаюць,
І ловіш гукі
Песні залатой…

Шукаеш словы,
Вольныя, як вецер…
Ідзеш удаль,
Не прыпыняеш крок…
Здаецца,
Слова вернае прыкмеціў, —
Але ж яно
Не ставіцца ў радок…

Ізноў ідзеш,
Ізноў яго шукаеш,
Самоціцся,
Хвалюешся,
Маўчыш…
І з кожным словам
Кожны раз згараеш,
Хаця аднойчы, знаеш,
Што згарыш…

***

Сівізна даўно кранула скроні.
Вечарэе. Суцемкі. Агні.
І ляцяць сярэбраныя коні,
І ляцяць сярэбраныя дні…

Што ж, як утрапёны, што шукаю?..
Што не супакоюся ніяк?..
Недзе еду, недзе ўсё блукаю…
І чаму я гэтакі дзівак?..

Горкі быт, бы ў горле маім костка,
Мітусня мне гэта не з рукі…
Лепей дзесь ісці за ціхай вёскай
І шаптаць дзівосныя радкі…

Ах, якія песні на ўлонні!
Як зіхцяць удалечы агні!..
І ляцяць сярэбраныя коні,
І ляцяць сярэбраныя дні…

***

Больш нічога не чакаю:
Кожны дзень — як гром,
Хоць мой дзень яшчэ здзіўляе
Сонечным радком…

І такія зззяюць далі,
Быццам дваццаць тры…
Адшумелі, адспявалі
Юныя вятры…

Не мяняў перакананняў,
Быў такі, як ёсць…
Позні мой радок ці ранні —
Бачны ён наскрозь…

Цешыць сонцам дзень асенні…
З вышыні гадоў
Я цаню усе адценні
Праспяваных слоў…

***

Дзеля песні высокай,
Дзеля гэтай раллі,
Дзеля гэтых аблокаў
Трэба жыць на зямлі…

Хай спяваюцца песні,
Хай звіняць жаўрукі…
Тут, на ўлонні, увесь я,
Тут — наросхрыст радкі…

Я жыву гэтым мігам
І заўжды буду жыць:
Як раскрытая кніга,
Даль навокал ляжыць…

Юлія АЛЕЙЧАНКА

***

Засынае лісце, засынае,
Зеляніны мокрай бачыць сны.
Не чакае лісце, не чакае
Ні разгулу шчасця, ні вясны.

Хутка выйдуць першыя мяцелі
І хаўтурна змерзнецца зямля.
Адляцелі мроі, адляцелі —
Ўсё, што бліжай, бачыцца здаля.

Італьянскія малюнкі

Шукала лінію смерці
На ўласнай, яго руцэ.
У гуках імклівых скерца,
На збітай дажджом шчацэ.
Хацела проста разбіцца
З вільготных прыморскіх пліт.
Вярнуцца ў тугім граніце
У свой безнадзейны скіт.

Шукала цені цыганак,
Атруту ў муранавым шкле.
…А чайка зноў рэжа ранак,
Бы крэска на шэрым тле.

***

Звіняць у пустой галаве
ўсе манеты зорак —
Мяне ты купіў за найлепшую ў свеце
валюту.
Пад покрывам ночы не бачаць Алах
і Буда,
Пад покрывам жарсці не чуюць
Хрыстос і Одзін…

Сталёвым крылом разразаецца
неба сустрэчы:
Са мною навекі — навекі чужы, далёкі.
Парсцёнкам разрэзаны палец,
жыццё і воля,
Свабодай разрэзаны розум,
шляхі ў нябыт.

Мая адзінота — нябачная сіла мроі.
Я — страшны сапернік.
Губляць мне няма чаго.

***

Павінна быць нешта большае за цябе.
Не сон, не віно, не вецер і не спатоля.
Што ў душах расце,
як сонца ў сівой журбе,
Што плешчацца побач недзе,
як наша воля.
Павінна быць нешта большае за мяне.
За дзень, за апошні стрэл
і за першы водар.
Што як ні круці, ні бойся, а не міне,
Што птушкай здзяўбеш з далоняў
чыіхсьці шчодрых.
І выплыве неяк ноччу з тваіх грудзей
Як рэха густога,
млоснага стогну-крыку…
На сэрца адно паболее між людзей,
Адродзіцца твар загубленай Эўрыдыкі.

***

Вырасціць дрэва, завесці ката…
Усё пустое, усё лухта.
Што рабіць,
як ад гэтага хлопчыка
трапеча птушка ніжэй жывата?
Выпроставе крылы за межы душы…
Ты толькі дыхай, услых не кажы,
што маўкі патонуць, а чэрці згараць.
У страшных казак
заўсёды
канец шчаслівы.

***

Гэты горад люляе-гушкае,
Як ілюзія волі,
Дзіўным слодычам болю.
Знойдзеш сэрца сваё пад падушкаю:
Як будзільнік дрыжыць, жывое.
Ды адкладзена зноў на заўтра,
На weekend, адпачынак, пенсію.
Зноў рамонт. Будаўнічай лесвіцай
Кампраміс вырастае ўпарта.

Фота Кастуся Дробава.

ПАРЫЖ, ЭЙФЕЛЕВА ВЕЖА І ДВА ПРАЦЭНТЫ

Урывак з рамана

Віктар ПРАЎДЗІН

Стомлены спякотны летні дзень паціху саступаў месца мяккаму цёпламу вечару, і лёгкі ласкавы вятрыска ўжо навяваў з блізкага возера ледзь улоўную прахалоду. Пасля душнага кабінета Гурскаму нечакана захацелася кінуцца, нырнуць у серабрыстую азёрную прахалоду і плыць пад вадой да стомы, плыць, на колькі хопіць дыхання.

— Эх, добра было б пакупацца, — быццам адчуўшы настрой Алеся, ажывіўся Дабрынкін, — вадзічка што трэба... і стому знімае... і настрой паляпшае.

— Спярша ў майстэрню, а потым відаць будзе, — рэзка адмовіўся Гурскі. Пры іншых абставінах ён першы прапанаваў бы пайсці на возера, але цяпер нават у дробязях не хацеў пагаджацца з Дабрынкіным.

— Калі так, мой конь напагатове, — з напускной бравадай сказаў старшыня і накіраваўся ў двор канторы, дзе ў цяньку пад разгалістым дубам чорнай маціцай задзірліва пабліскваў новенькі «Крайслер».

— Ого!.. — Не стрымаў захаплення Гурскі. — Аказваецца, у гаспадарцы не так усё і кепска... Толькі чаму хаваеце?..

— З песні слоў не выкінеш, — імгненна спахмурнеў Дабрынін. — «Крайслер» — спадчына папярэдніка... Каб яму добра было ў тых дэпутатах! Спадчыну пакінуў — як свінню падлажыў... Перад людзьмі сорамна... Гаспадарка на ладан дыхала, а ён толькі каб сябе паказаць... Вось і хаваю...

— Не трэба — прадайце, — з падножкі зазіраючы ў салон, прапанаваў Алесь, — машына павінна ездзіць... А ў дэпутаты, наколькі мне вядома, лепшых выбіраюць...

— А вы купіце? — узрадавана ўскрыкнуў Дабрынкін.

— Не-е, — адмахнуўся Гурскі, — у маім выпадку машына не раскоша, а паўнапраўны сябра фірмы, яна павінна прыносіць грошы... Вашу і прадстаўнічай не назавеш, а трымаць дзеля выезду на рыбалку ці паляванне — і сапраўды вялікая раскоша.

— Вы не першы, хто ў захапленні ад «Крайслера», а каб купіць — не. Што ж, буду чакаць і шукаць пакупніка.— Дабрынкін перакінуў з рукі на руку ключы ад машыны і асцярожна, з хітрынкай у вачах, ціха зазначыў: — Калі ехаць у аб'езд — тры кіламетры, калі пешкі нацянькі — метраў трыста...

— Наўпрост хутчэй, значыць, лепш, — імгненна пагадзіўся Алесь. Сказаў і здзівіўся, яго больш не раздражнялі непрыхаваныя вясковыя хітрыкі Дабрынкіна.

Натуральна, дабрынкінскія трыста метраў расцягнуліся, па меншай меры, на кіламетр, але Гурскі быў задаволены. Напэўна, упершыню ў жыцці ён уздыхнуў на поўныя грудзі, дыхаў і не мог надыхацца чыстым вольным паветрам, набрынялым водарам лугавых траў. З блізкага лесу патыхала прахалодай, чаборам, хвояй, і гэты водар скалануў сэрца, жывіцай напоўніў спусцелую душу. Алесь не стрымаўся, скінуў абутак і няспешна басанож пасунуўся па цёплай, казытлівай траве. Нечакана амаль з пад самых ног выпырхнуў жаўрук, і праз імгненне над галавой разлілася звонкая пераліўчатая трэль. І штосьці ў душы Алеся як надламалася, здалося, што ўжо некалі быў на гэтым лузе, бегаў пад дажджом і сонцам, ляжаў у пахучай траве з заплюшчанымі вачыма, абласканы сонцам і ветрам... Калісьці ён быў вольны, як гэтыя жаўрукі, і шчаслівы...

Алесь не заўважыў, як разам адступілі праблемы. Не, яны не адступілі, яны здаліся мізэрнымі, амаль нікчэмнымі ў параўнанні з пачуццём поўнай душэўнай свабоды. Нечакана ён зразумеў, што ўсё перажытае: і здрадніца жонка, і хлуслівы брат, і нават бізнес — былі дарогай да гэтага поля, лесу, возера...

Дабрынкін не прыспешваў госця. Ён прысеў каля вялікага валуна на ўскрайку поля і моўчкі чакаў, калі капрызны багацей нацешыцца.

«Не, не зразумець мне гарадскіх багацеяў, — прыплюснуўшы вейкі, думаў старшыня. — Гурскі гаворыць, а напэўна, і думае, што ў дэпутатах лепшыя гаспадарнікі... Ды там іх, лепшых гаспадарнікаў, быць зусім не павінна... Лепшыя абавязаны на зямлі працаваць, народ карміць... Зрэшты, калі ты ўзняў гаспадарку да такой вышыні, што зарплата ў сялян вышэйшая за сталічную і моладзь не бяжыць у горад па лепшую долю, калі ў аддзеле кадраў чэргі на месца даярак і механізатараў, калі адчуваеш, што больш для людзей нічога не зробіш, — ідзі ў дэпутаты, пішы правільныя законы. Вядома, пры ўмове, што талковую змену падрыхтаваў, выхаваў і ўпэўнены, што наступнікі не кінуцца набіваць кішэні свае і ўсёй радні, што не спусцяць справу ў трубу. Бач, аргумент знайшоў, людзі галасуюць!.. Разумны чалавек, а не можа дапетрыць, што часцяком галасуюць ад бязвыхаднасці, абы пазбавіцца... А потым хто і як тыя галасы лічыць?.. Дый сам яшчэ той гусак!.. Уварваўся ў кантору, быццам канец свету ўбачыў... Паперкі торкае, пагражае... Губы ад злосці трасуцца... А цяпер во басанож кружыць па полі — і нічога не трэба. Але хіба яму галава баліць пра надоі малака?.. Жніво?.. Хіба думае пра афрыканскую чуму свіней, што ўжо гаспадарыць у суседнім раёне, а заўтра і мая ферма ў дваццаць тысяч галоў можа згарэць сінім полымем? А мо думае пра кармы, сілас на зіму для каровак?.. Бач, машыну запаскудзілі!.. Сам вінаваты!.. Чаго пёрся ў статак?.. Стань, прапусці... Папрывыкалі, каб усе дарогу саступалі! Пыхі да неба... Хочуць сброзь быць першыя...»

Дабрынкін схамянуўся, агледзеў поле і, не ўбачыўшы Гурскага, падхапіўся на ногі.

— Ну, што за дзень такі? — Горка прамовіў старшыня. — Чалавека вочы водзяць, а гэтага алігарха — нячыстая... На хвіліну прысну, а яго і след прастыў...

Ён подбегам вярнуўся да таго месца, дзе кружыў Алесь, спадзяваўся знайсці Гурскага ў траве, але яго не было.

Алесь даволі хутка ачуняў ад нечаканага ці то раскаяння, ці то шкадобы да сябе. Будзіць разамлелага на сонцы Дабрынкіна не стаў, прайшоў міма валуна, па ледзь прыкметнай сцежцы ўскараскаўся на вялікі пагорак і адразу ўбачыў майстэрні.

Тры вялікія незавершаныя пабудовы без дзвярэй і акон, абнесеныя драцяным іржавым плотам, сапраўды месціліся далекавата ад вёскі і блізка да лесу. Праз некалькі хвілін Гурскі падышоў да варот, скінутых з завесаў, і раптам з перакошанай, наспех збітай драўлянай будкі, махаючы рукамі, выбег чарнявы невысокі чалавек у стракатай кваццістай цюбецейцы на галаве.

— Таварыш, сюдой не хады, дырка в забор хады, — з азіяцкім акцэнтам выпаліў чарнявы і, раскінуўшы рукі ўшыркі, амаль закрычаў: — Сюда апасна... — ён ускінуў рукі ўгору і паказаў на высачэзны шлагбаум. — Вецер дует — палка падает... Ой, савсем плохо будет голова... Дырка в забор не апасна... Туда хады...

Алесь, з асцярогай пазіраючы больш на азіята, чым на шлагбаум, прайшоў на мехдвор праз «дырка», на якую паказваў вартаўнік.

Пустыя пабудовы, гэткі ж пусты панадворак, толькі тры старыя камбайны сіратліва туліліся каля аднаго з ангараў. Каля тэхнікі некалькі чалавек у зашмальцаваных камбінезонах і адзін у белай каткаватай тэнісцы, якая не магла схаваць вялікага жывата, аб нечым спрачаліся. Чалавек у тэнісцы штосьці даказваў, махаў рукамі, торкаў пальцам угору, маўляў, пагода вінаватая ці начальству лепш відаць, але, убачыўшы незнаёмца, усе сціхлі.

За спінай пачуліся крокі, Алесь азірнуўся.

— Інжынер ваюе, — шырокай шчаслівай усмешкай расплыўся Дабрынкін і, крыху аддыхаўшыся, дадаў: — Алесь Пятровіч, вырашылі без мяне майстэрню наведаць?

— Вы гэтак салодка спалі... Напэўна, і сапраўды, прымацкае жыццё не мёд... — Не вытрымаў, падкузьміў старшыню Гурскі.

— Салодкага, вядома, мала, але ж і ў прымакі не кожнага прымаюць, — з хітрынкай у вачах парыраваў насмешку Дабрынкін.

— Тры камбайны?.. І гэта ўсё, што мае гаспадарка? — паспешліва змяніў тэму Гурскі і імгненна пашкадаваў. Шматслоўны Дабрынкін быццам чакаў гэтага пытання.

— Што-нішто з тэхнікі — у старой майстэрні... Сюды ж пераганяем толькі новае ці адрамантаванае, — цяжка ўздыхнуў старшыня і заклапочана дадаў: — Камбайны падрыхтавалі, а да канца жніва хоць бы адзін дацягнуў. Ураджай плануем сабраць неблагі, натуральна, калі пагода не падпаскудзіць... Толькі наш канёк — малако, мяса і...

— Дзім Дзімыч?!.

Надрыўна гукнуў інжынер, і дабрынкінскае «і» быццам завісла ў паветры. Расчырванелыя трактарысты рашуча падыходзілі да старшыні, следам сунуўся пахмурны інжынер.

— Дзім Дзімыч, хоць вы растлумачце сітуацыю з новай тэхнікай, — умольна крыкнуў інжынер. — Нічога слухаць не хочуць... Вынь да палож... Аргументаў не хапае...

— Аргументаў у яго не хапае! — незадаволена шэптам перадражніў інжынера Дабрынкін. — Дэмагог! Людзі працаваць прыйшлі, а не аргументы слухаць. — Ён зірнуў на Гурскага: — Алесь Пятровіч, пару мінут пачакаеце?

— Пачакаю, — згодна кіўнуў Алесь і, нібыта незнарок, зірнуў на сонца, якое няўмольна кацілася да гарызонту.

Старшыня заўважыў гэты нецярплівы позірк і ўжо на хаду, думаючы пра нешта сваё, машынальна абнадзеіў:

— За машыну не хвалюйцеся: Ціхан паабяцаў — Ціхан зробіць!

Алесь некалькі хвілін вагаўся. Яму і грознага Ціхана карцела знайсці, і гаворку Дабрынкіна з трактарыстамі паслухаць. Другое перасіліла.

Цяпер Дабрынкін не выглядаў гэткім прастачком, здавалася, нават ростам пабольшаў, гаварыў гучна, упэўнена:

— На апошнім агульным сходзе мы, а дакладней вы, прагаласавалі за тое, каб выціснуць з тэхнікі ўсё магчымае і немагчымае, а толькі потым, аднавіўшы пагалоўе жывёлы, дабудаваўшы фермы, майстэрні і аграгарадок, думаць пра новыя трактары і камбайны.

— На гэтых, — адзін з трактарыстаў махнуў рукой на старыя камбайны, — і на чай не заробіш... Як сям'ю карміць?..

— Мы газеты чытаем і ведаем, што ў Лацянкова з Бялыніцкага раёна механізатары атрымліваюць міністэрскую зарплату, — няўпэўнена пераступіўшы з нагі на нагу, выпаліў трактарыст з чырвоным тварам і чорнымі акулярамі на носе.

— А яшчэ ў іх масла хлебам мажуць... — ва ўнісон пачутаму паблажліва пакпіў з трактарыста старшыня і сурова дадаў: — У чужой кішэні лёгка грошыкі лічыць, і ад зайздрасці багатым не станеш... А калі хочаш міністэрскі заробак — ідзі ў міністры...

— Ха-ха-ха, — дружна зарагаталі трактарысты, — наш Федзька ў міністэрскім крэсле...

Перасільваючы смех, хтосьці перадражніў дыктара радыё:

— Увага-ўвага, гаворыць беларускае радыё, перадаём апошнія звесткі з палёў... Сягоння Фёдар Дустаў паддаў, падсыпаў дусту Дабрынкіну, старшыні сельскагаспадарчага прадпрыемства «Новы шлях»...

— Ха-ха-ха...

З высокіх бяроз, што раслі непадалёк, узнялася чарада перапужаных крыклівых варон. Гэта зрабіла гаворку зусім жартаўлівай.

— А вось і электарат новаспечанага міністра, — прабасіў трактарыст, які гаварыў пра сям'ю.

— Электарат крыклівы, бесцырымонны і развязны, як і будучы міністр, — дадаў інжынер.

Трактарысты за словам у кішэнь не лезлі, жарты, кпіны сыпаліся з усіх бакоў. Рагаталі доўга, да слёз, і нават Федзя, зняўшы акуляры, далонню цёр вочы. Калі смех пачаў аціхаць, Дабрынкін нечакана для ўсіх запытаўся:

— А што, мужыкі, мо сапраўды пусцім фермы пад нож і будзем катацца на новай тэхніцы?

Трактарысты імгненна прыціхлі, нехта заклапочана запытаўся:

— Праесці нядоўга, а потым што? Недзе людзі працуюць і добра зарабляюць, а мы?.. Хіба з іншага цеста?.. Лайдакі і абібокі?..

— Як кажуць, не ў брыво, а ў вока... На гэта з наскоку і не адкажаш... Дый адна ластаўка вясны не робіць... Як жыць і працаваць далей, талакой вырашаць будзем... Праз два дні на сходзе, — стрымана ўсміхнуўся старшыня і, хітравата зірнуўшы на суразмоўцаў, ажывіўся: — А я згодны, што без новай тэхнікі на ногі не станем. Толькі каму на ёй працаваць? Вось ты, Фёдар Дустаў, — Дабрынкін тыцнуў пальцам трактарыста ў грудзі, — табе можна даверыць немца «Лемкена», а можа, нават «GLASSa»?

— А што?.. І паеду!.. — трактарыст зняў акуляры, расправіў плечы, фанабэрліва зірнуў на прысутных: — Кніжкі пачытаю і паеду.

— Што-што, а ездзіць ты зух: штомесяц тармазныя калодкі мяняем, — загарачыўся інжынер. — Болт не знойдзеш і не закруціш, пакуль механік не паднясе.

— Кожны жыве сваім мазалём, і не трэба валіць з хворай галавы на здаровую, — загарачыўся трактарыст. — Дарма і каза не скача... Няхай механік даплачвае, калі не спраўляецца.

Гурскі кашлянуў у кулак, нагадаў пра сябе, і старшыня імгненна прыпыніў гаворку. Спрачацца і высвятляць адносіны не было жадання, наперад ведаў, у чым абвінавацяць і механіка, і яго, дый усё начальства без выключэння...

Дзень мастацтва — 1914

Упачатку Першай сусветнай вайны ў расійскай грамадскасці маштабна актуалізавалася славянскае пытанне, а патрыятычны ўздым і поспех першых баявых дзеянняў спарадзіў агульныя спадзяванні на хуткую перамогу. Хроніка падзей, іх аналітычнае і мастацкае асэнсаванне не сыходзілі са старонак перыядычнага друку. У выдавецкай справе запачаткоўваліся кніжныя серыі, кшталту маскоўскай «Войны и культуры», у якіх выдаваліся папулярныя брашуры па нацыянальным пытанні. Канстанцін Някрасаў, дэпутат Дзяржаўнай думы Расійскай імперыі, пляменнік паэта Мікалая Някрасава, арганізаваў у Маскве і Яраслаўлі з'яўленне на свет серыі «Библиотека войны», дзе прадстаўляліся рускія і замежныя аўтары (галоўным чынам французскія — Альфонс Дадэ, Гі дэ Мапасан, Праспер Мерымэ), якія ў сваёй творчасці закраналі тэму гісторыі антынямецкага супрацьстаяння. Тут выйшаў шэраг гісторыка-этнаграфічных нарысаў Максіма Багдановіча: «Червонная Русь (Австрийские Украинцы)», «Угорская Русь», «Братья-чехи».

Працяглы час Першая сусветная вайна знаходзілася ў цені Другой сусветнай, мела ідэалагічны ярлык «імперыялістычнай» і не была ў ліку прыярытэтных напрамкаў навуковых даследаванняў. Між тым у заходнееўрапейскай гістарычнай традыцыі менавіта гэты глабальны канфлікт прынята называць *Great war* (Вялікая вайна). Першая сусветная спарадзіла спачатку паэзію «акопнай праўды», а потым — і міжкантынентальную літаратуру «страчанага пакалення».

Няйнакш як табуіраванасцю некаторых тэм «імперыялістычнай» вайны можна вытлумачыць працяглую адсутнасць у фокусе даследчыцкага бачання беспрэцэдэнтнага выдання — шматмоўнага літаратурнага зборніка, выдадзенага ў Вільні 8 снежня 1914 года ў друкарні Марціна Кухты. Паколькі кніга ўжо даўно стала бібліяграфічнай рэдкасцю, спатрэбілася дапамога спецыялістаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, каб атрымаць копію экзэмпляра, што захоўваецца ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы (Масква), а таксама кансультацыі кіраўніцтва Цэнтра Яўрэйскага мастацтва пры Яўрэйскім універсітэце ў Іерусаліме — каб сарыентавацца ў тэкстах на іўрыце.

На вокладцы назва прадубліравана паруску, па-польску, па-літоўску, па-беларуску і па-яўрэйску. Беларускі вырыянт гучаў у адпаведнасці з тагачаснай традыцыяй — «Дзень штукарства». Сённяшні ўнармаваны літаратурны адпаведнік — «Дзень мастацтва», яго мы і будзем прытрымлівацца ў гэтай публікацыі з мэтай пазбегнуць магчымых негатыўных канатацый.

Тлумачэннем вынасу на вокладку канкрэтнай даты выхаду ў свет можа паслужыць аб'ява на адной са старонак выдання на польскай мове, у перакладзе:

«Польскі тэатр.
Сёння 8 снежня 1914 г.
на карысць пацярпелых падчас вайны
даецца прадстаўленне ад 5 гадзін па палудні да 11 вечара, без абмежавання па часе ўваходу і выхаду.
Праграма вельмі разнастайная».

Такім чынам невялікая кніга выканала не толькі высокую гуманную місію, але і прагматычную рэкламную ролю, што лішні раз гаворыць на карысць беспрэцэдэнтнасці, якая ў дачыненні да гэтага выдання мае сістэмны характар.

ПА СТАРОНКАХ ВЫДАННЯ

Зачынную старонку, якая стала адмысловам камертонам поліфанічнага гучання ўсяго зборніка, сфарміравалі тэксты аўтарытэтных дзеячаў літоўскай, рускай і польскай культур. Поруч былі змешчаны ўрывак з запісаў спачылага кампазітара і мастака Мікалоюса Канстанцінаса Чурлёніса «Поўны працоўны дзень», малітоўны зварот да Бога ў клопатах пра «спакой для людзей добрай волі» гісторыка і літаратара Люцыяна Уземблы. Паэтычнай сарцавінай першай старонкі стаў верш «В Вильне» Валерыя Брусава. (З пачаткам Першай сусветнай вайны адзін з найвядомейшых паэтаў, заснавальнікаў рускага сімвалізму, адправіўся на фронт у якасці ваеннага карэспандэнта.) У вершы, датаваным 17 жніўня 1914 года, створана карціна горада, прыгаломшанага ахвярамі вайны. Над жалобнай цемрай касцёлаў уздымаецца апякун Вільні — Казімір, велічна ўзвышаецца сабор святой Ганны. Эмацыянальны акцэнт шматнацыянальнага горада і аптымістычна-пераможны акорд гучаць ва ўнісон у заключных радках твора:

И море все той же печали,
Все тех же маленьких бед
Шумит в еврейском квартале
Под гулы русских побед.

Адпаведны этнічны складнік у зборніку падмацоўвае апавяданне «З яўрэйскіх трагедый», аўтар якога, вядомы ў той час пісьменнік і журналіст Цытрон Шмуэль Лейб (1860—1930), апісвае гісторыю свайго супляменніка на вайне.

Зборнік «Дзень мастацтва» сабраў пад сваёй вокладкай актуальныя творы прадстаўнікоў розных пакаленняў нацыянальных літаратур, скампанаваныя такім чынам, што паэзія і проза пададзены не паслядоўна-«адслоена», змяняючы адну нацыянальную прадстаўленасць другой, а нібы пераплецена: ад старонкі да старонкі побач суіснуюць розныя мовы і графічныя сістэмы. Да таго ж у структуру кнігі арганічна ўключаны ілюстрацыі (найперш карыкатуры), адпаведныя ваеннаму часу, што істотна ажыўляе візуальнае ўспрыманне зборніка.

Некаторыя з вядомых творчых асоб паўсталі ў кнізе ў нечаканай іпастасі. Так, Канстанцін Галкоўскі (1875—1963) традыцыйна пазіцыянуецца як літоўскі і беларускі кампазітар, аўтар многіх музычных твораў, заснаваных на беларускім фальклоры і вершах Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, Ф. Грышкевіча і інш. У «Дні мастацтва» перад намі — рускамоўны празаік, які рэпрэзентуе ўрывак са сваёй кнігі «Песнь Песней о Музыке» пад назвай «Религия будущего». Будучыня бачылася аўтару ў ідэалістычным арэоле, адпаведным ідэйна-эстэтычным прыярытэтам літаратуры Сярэбранага веку:

«Не знаю, скоро ли, через десятки — сотни лет, но свято верю в то, что когда-нибудь все люди объединятся в одну братскую семью.
И придет этот час, когда у них будет одна пантеистическая религия — культ Красоты "вселенской", соединенный с культом Любви "вселенской"».

Думаецца, віленскі зборнік 1914 года стаў заўважным эпізодам у творчай дзейнасці аўтараў, падпісаных поўнымі імёнамі, псеўданімамі і крыптанімамі: рускіх (Валерий Брюсов, Юрий Солнцев, К. М. Галковский), літоўскіх *(M. K. Čiurlionis, Zigmas Žviksas, Adomas Juodasis, Balys, J. Patamsis)*, польскіх *(Lucjan Uziębło, K. Grzymała, Z. Ł., Janina Wasiewiczówna, Tadeusz Orłowski)* і інш.

Фота з сайта videopolk24.ru

Аб'ектыўна выданне працавала на карысць легітымацыі і роўнасці ўсіх нацыянальных культурных традыцый.

Пад некаторымі творамі пазначаны месца (Вільня і Віленскі край) і нядаўні час іх напісання. Грамадска-палітычная надзённасць мастацкіх практык рэалізавана ў розных стылёвых сістэмах (сімвалізм, рамантызм, рэалізм), пры спецыфічным светапоглядным адчуванні (фальклорным і рэлігійна-філасофскім), вырашана ў розных планах грамадска-сацыяльнага бачання (агульнадзяржаўным і лакальным / краёвым).

Для сучаснікаў сама назва зборніка ў яе рускамоўным вырыянце — «День искусства» — не магла не выклікаць асацыяцый з існуючым мастацкім аб'яднаннем «Мир искусства» (1898—1927) і аднайменным часопісам, што выходзіў у Пецярбургу ў 1898—1904 гадах і быў своеасаблівым рупарам новых павеваў у рускай культуры мяжы стагоддзяў. З багата ілюстраваным выданнем супрацоўнічалі вядучыя мастакі свайго часу (Рэпін, Паленаў, Сяроў, Левітан, Бакст і інш.), папулярныя майстры слова (Мережкоўскі, Гіпіус, Розанаў, Салагуб, Белы, Брусаў і інш.).

БЕЛАРУСКІ СКЛАДНІК

Тэма народных пакутаў падхоплена на другой старонцы вершам «Вавілон (З казак мінуўшчыны)» паэта Ясакара, які ў гэтым зборніку выступіў таксама як празаік з апавяданнем «Варажба», падпісаным псеўданімам Змітрок Бядуля. Такім чынам аўтар прадэманстраваў магчымасці свайго мастацкага дыяпазону, рэпрэзентаваў эмацыянальна-трагічны зварот да старажытнасці і тэхніку рэалістычнага пісьма з відавочным уплывам рамантычнай традыцыі.

Янка Купала прадставіў пэўны этап сваёй працы над цыклам антываенных вершаў «Песні вайны», які, як адзначаў у свой час Мікола Грынчык, «засведчыў імклівы рост самасвядомасці шырокіх народных мас напярэдадні Кастрычніцкіх падзей, паглыбленне антываенных матываў ва ўсёй тагачаснай беларускай рэвалюцыйна-дэмакратычнай літаратуры».

Вершы цыклаў «Варожбы», «Перад бурай», «Склік», «Разлука», «Засталіся нівы, сёлы» папярэдне былі апублікаваны ў «Нашай ніве» 2 кастрычніка — 6 лістапада 1914 года. «Пабоішча» будзе завершана 18 снежня і надрукавана ў гэтай жа газеце 25 снежня 1914-га, а таму ў «Дні мастацтва» не прадстаўлена.

Спеўна-народная традыцыя засведчана ў эпіграфе да твора:

Вазьмі, маці, пяску жменю,
Пасей, маці, на каменю.
Як прыйдзешся з пяску ўсходу,
Тады верне сын з паходу.

Цалкам Купалаўскі твор прагучаў на сімфанічны лад. У «Варожбах» адчуваецца мастацкая спадкаемнасць зачыннай часткі «Дзядоў» Адама Міцкевіча:

На ўзбярэжжы, над ракою
Шэпчуць вербы з асакою:
— Што-то будзе, што-то будзе?
Штось трывожны свет і людзі.

Завяршэнне пятай структурнай часткі — «Асталіся нівы, сёлы» — трагічна-запытальнае, вытрыманае ў адраджэнцкіх традыцыях:

А за вёскай, дзе магілы,
Дзе ляглі, заснулі сілы,
Пахіліўся крыж да крыжа —
Гэты ніжай, гэты вышай.

На крыжы сава якотам
Гаманіць адказ сіротам
Ды пытаннем страшным страшэ:
«Га! дзе-ж бацькаўшчына ваша?»

Для Янкі Купалы, можам меркаваць, другая палова 1914 года прайшла пад знакам асабістага знаёмства з Валерыем Брусавым. Пра гэта, акрамя біяграфічных звестак, яскрава сведчаць дарчыя аўтографы на зборніку «Шляхам жыцця»: «Валерыю Якаўлевічу Брусаву на добрую памятку першага спаткання ў Вільні ад вучаніка і паклонніка Я. Купалы. Вільня. 18/VIII—1914 г.», а таксама выданнях «Адвечнай песні» і «Сну на кургане». У жніўні 1914-га Брусаў пераклаў на рускую мову Купалавы вершы «Як у лесе зацвіталі…», «На Купалле», «Адцвітанне», «У ночным царстве», апублікаваныя ў віленскай «Вечерней газете».

Калі Змітрок Бядуля і Янка Купала жылі на той час у Вільні, па ўсім відаць, бралі непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы гэтай кнігі, то яшчэ адзін беларускі ўдзельнік гэтага культурнага праекта — Алесь Гарун — быў далёка ад паплечнікаў. Ужо колькі год як ён адбываў у Сібіры судовае пакаранне за сваю антыўрадавую дзейнасць, адтуль у 1914-м пераслаў у Вільню рукапіс падрыхтаванага ім зборніка «Матчын дар», які пабачыў свет толькі ў 1918 годзе.

Верш Алеся Гаруна «Праводзіны» — гэта, па сутнасці, пералік наказаў хлопцу, якога выпраўляюць на вайну. Сярод іх — і характарыстыка актуальным падзеям, вытрыманая ў гуманістычных традыцыях:

Сорам і ганьба для свету вайна,
Як ні мяркуй, ні судзі;
З Боскіх законаў смяецца яна…
Мусіш аднак жа… Ідзі!

Ідэя чалавекалюбства ўзмоцнена аўтарам у радках, дзе падкрэслена стаўленне да ворага:

Будзе праціўнік пабіты ляжаць —
Ты пашкадуй яго, брат!
Раны завяжаш, паможаш устаць,
— І ён чалавек і салдат.

Першае ўражанне ад знаёмства з рэдкім выданнем: чатыры беларускія творы на старонках невялікага віленскага выдання годна засведчылі стан і поспехі нацыянальнага пісьменства, цалкам парытэтна і нават выйгрышна суседнічаюць з іншамоўнымі творамі. На чарзе — скрупулёзная тэксталагічная праца і ўважлівы кантэкстуальны разгляд.

Мікола ТРУС

СОНЕЧНЫЯ ЗВАНЫ

Сярод літаратараў Берасцейшчыны старэйшага пакалення вылучаецца паэт і празаік Расціслаў Бензярук, які доўгі час працаваў у мясцовай раённай газеце і жыве ў Жабінцы.

Новая кніга таленавітага творцы — паэтычны зборнік «Вішнёвая квецень». Першую частку выдання складаюць вершы і паэма «За адным сталом». Лейтматывам зборніка з'яўляюцца радкі з першага верша, якім адкрываецца раздзел «Абуджэнне»: «Усё ў прыродзе ведае свой час, / А значыць, не спазняецца прыходзіць… / Вясна — і птушкі зноў ляцяць да нас, / А мы раўняем грады ў агародзе. / Падзелен год — цяпло і халады, / Пара пасадак і збірання ураджаю / Да нас з'яўляюцца, прыходзяць, як заўжды… / "Калі ж пара кахання?"— разважаем. / Кахання час, як павучаў народ, / Заўсёды з намі, круглы год»…

Асобны раздзел кнігі — «У вянок паэту», дзе сабраны творы, прысвечаныя паэтам і паэзіі, літаратарам, з якімі Расціслава Бензерука звязвае нешта сваё, уласнае, асабістае…

Значную частку «Вішнёвай квецені» займаюць пераклады. Другая частка кнігі называецца «Ручнікі вышываныя ў модзе…» Першы раздзел — пераклады з украінскай мовы «Сонечныя званы». Расціслаў Бензярук пераўвасабляе творы Лесі Украінкі.

Ці толькі зоркі на шляху знайду,
Ці трапіцца парою і квяцістасць?
Да мэты ўсё-такі я некалі дайду,
Ці без пары закончу шлях цярністы?
Жадаю, каб закончыўся мой шлях,
Як пачынала, з песняй на губах.
(«Мой шлях»)

У лютым 2021 года Украіна, а з ёй і ўвесь славянскі свет адзначаць 150-годдзе з дня нараджэння славутай украінскай паэтэсы. І, несумненна, будуць згадвацца повязі гэтай выбітнай асобы ўкраінскага асветніцтва з Беларуссю, беларускай культурай і літаратурай. Будзем спадзявацца, што выйдзе і новая беларуская кніга Лесі Украінкі. У любым выпадку абавязкова павінны з'явіцца новыя пераклады яе паэзіі ў беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыцы. Мо нават у альманаху «Далягляды», які ўзноўлены ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», пачынаючы з 2018 года… І тут Расціслаў Бензярук — незаменны рупліўца ў справе сённяшняга прачытання творчай спадчыны Лесі Украінкі.

У раздзеле «Сонечныя званы» — іншыя пераклады творцы з украінскай паэзіі: вершы Уладзіміра Кітаеўскага (украінскі паэт, які нарадзіўся ў 1896 годзе ў Жабінкаўскім раёне), Юрыя Кавальскага, Віктара Лазарука, Аксаны Гундэр, Міколы Цялічкі, Віктара Качэўскага.

«Кветка папараці» — пераклады вершаў рускіх паэтаў Аляксея Бакуменкі, Уладзіміра Высоцкага, Сяргея Вікулава, Уладзіслава Бахарэўскага, Рамана Левіна, Веры Пагрэб, Кацярыны Гарбоўскай.

Не забывай са скібкай пірага…
Калі апоўначы зліпаюцца павекі,
прыпомні, што вытокі маюць рэкі,
бязмежныя нярэдка ў берагах.

Бліжэй здаюцца зоркі часам нам
таму, што плуг не заржавее ў полі,
што з хлебам павярнецца баразна…
Не забывай пра гэта аніколі!
(Сяргей Вікулаў. «Плуг і баразна»)

Трэці раздзел у другой частцы, дзе змешчаны пераклады, — «Кахаю цябе!»: тут Расціслаў Бензерук сабраў пераўвасабленні з польскай паэзіі: творы Альбіна Дзяконскага, Юзафа Крашэўскага, Аляксандра Наўроцкага, Яна Рыхнэра, Бенедыкта Козела.

Наклад кнігі паэзіі «Вішнёвая квецень» Расціслава Бензерука — 100 экзэмпляраў. Зборнік пабачыў свет у Брэсце ў выдавецтве «Альтернатива». Выдатна было б, каб кніга трапіла не толькі ў бібліятэкі Берасцейшчыны. Паэтычныя вышукі жабінкаўскага літаратара, як і яго мастацкія пераклады, несумненна, гэтага вартыя.

Кастусь ЛЕШНІЦА

Даследчык Крэва

Аляксандр Камінскі знаходзіць новыя факты пра гістарычныя падзеі

Нас пазнаёміў верш. У часопісе «Куфэрак Віленшчыны» ў 2000 годзе былі змешчаны паэтычныя творы Аляксандра Камінскага. Асабліва ўразілі радкі пра кірмаш у Крэве. Імя аўтара мне на той час ні пра што не гаварыла. Але яго словы кранулі і ўсхвалявалі. Здавалася б, нічога асаблівага — звычайная зарыфмаваная замалёўка пра жыццё мястэчка. Ды толькі ў гэтым звычайным было занатавана столькі любові да родных мясцін!



Ніхто лепш за яго не ведае гісторыю Крэва і Крэўскага замка — першага вядомага цалкам мураванага абарончага збудавання на тэрыторыі Беларусі. Аляксандр Мікалаевіч — адзін з тых, чыя карпатлівая праца і нераўнадушнае стаўленне да амаль разбуранага помніка паспрыяла захаванню яго фрагментаў і падтрыманню ўвагі грамадства. Гісторыю малой радзімы даследчык занатаваў у шэрагу краязнаўчых артыкулаў, кніг, буклетаў. Гістарычныя дазнанні не абмяжоўваюцца агульнымі звесткамі пра мястэчка і ваколіцы — яны напоўнены ананіміраванымі фактамі штодзённага жыцця местачкоўцаў з іх своеасаблівым дыялектам, векавымі традыцыямі, прыгожымі мясцовымі легендамі, аздобленымі неверагоднымі прадказаннямі, жарсцямі і жартамі. Паэтычная душа пісьменніка праяўляецца ў стылі напісання кожнай з краязнаўчых кніг.

Не спадзеючыся на падтрымку спонсараў і зацікаўленасць выдавецтваў, краязнаўца, аформіўшы патрэбныя дакументы, сам пачаў друкаваць свае хронікі і даследаванні даўніны. Выдадзеныя невялікімі накладамі, багата ілюстраваныя рарытэтнымі фотаздымкамі, яго брашуркі запатрабаваныя тымі, хто неабыякавы да гістарычнай спадчыны Беларусі.

Кнігу «Пад хвалямі Крэўскага мора» ў 2002 годзе электронная бібліятэка «Беларуская палічка» прызнала найлепшым творам года. Назву ёй даў аднайменны верш, у якім аўтар заявіў пра сябе як паэт:

«…Зноў назад не вярнуць, хоць плач ты,
змытых бурнай вадой слядоў.
Зноў над хвалямі ўюцца хмары,
зноў грымяць, зіхацяць маланкі,
і крыжы паўстаюць, як мачты
затанулых навек гадоў».

Паэтычная муза не стала галоўнай абранніцай у творчым жыцці. Хоць яе прысутнасць адчуваецца ва ўсіх творах, нягледзячы на іх жанравую прыналежнасць. Усвядоміўшы аднойчы, на якой багатай гістарычнымі падзеямі зямлі ён жыве, краязнаўца прысвяціў жыццё вывучэнню і папулярызацыі гісторыі краю. Гэты куток Бацькаўшчыны, дзе пакінулі свой след гаспадары Вялікага Княства Літоўскага Альгерд, Кейстут, Ягайла, Вітаўт, дзе мясцовы люд некалькі стагоддзяў карыстаўся Магдэбургскім правам, стаў не проста прадметам яго даследаванняў, але натхняльнай крыніцай для цікавага творчага жыцця.

Працуючы настаўнікам замежнай мовы спачатку ў Мілэйкаўскай, а затым у Крэўскай школах, Аляксандр Камінскі значную частку вольнага часу прысвяціў вывучэнню мясцовых звычаяў, легенд, паданняў, адметнай дыялектнай мовы, уласцівай для жыхароў так званага Павілля. Яго стараннямі ў свой час набыў новы выгляд народны гісторыка-краязнаўчы музей Крэўскай СШ, які штогод наведваюць каля 1000 аматараў гісторыі. Многія з удзельнікаў арганізаванага ім напрыканцы 1990-х гадоў гуртка «Нальшаны» далучыліся да шэрагу краязнаўцаў.

Ці не Камінскі адным з першых паведаміў, што менавіта пад Крэвам прымалі баявое хрышчэнне ў гады Першай сусветнай вайны жанчыны з батальёна Марыі Бачкаровай. Нават месца паказваў удзельнікам навуковай экспедыцыі, дзе, на яго думку, і былі пахаваны ахвяры крывавай і няўдалай атакі, не падтрыманай стомленымі байцамі царскай арміі. На міжнародных канферэнцыях, прысвечаных падзеям так званай Мікалаеўскай вайны, даклады крэўскага краязнаўцы заўжды вылучаюцца навізной фактаў, цікавымі ілюстрацыямі, глыбокімі разважаннямі.

Дапытлівы даследчык шукае і знаходзіць усё новыя згадкі пра гістарычныя падзеі. Для Аляксандра Камінскага кожная пядзя Крэўшчыны — схованка гісторыі роду, а кожная старажытная рэч — артэфакт, які сведчыць пра ўмельства, кемлівасць і майстэрства местачкоўцаў. Разам з тым ён далёкі ад тых, хто абагаўляе мінуўшчыну, і заўжды з пэўнай доляй крытыкі ставіцца да таго, што не варта захаплення.

Некалькі гадоў таму на неабсяжных прасторах інтэрнэту з'явілася «Крэўскае мора» — краязнаўчы блог Аляксандра Камінскага. Мяркую, многія зазірнулі на яго старонкі, бо там шмат інфармацыі і цікавостак, аргументаваных высноў, пацверджаных фактаў.

Ала СТРАШЫНСКАЯ

Вандроўка з майстрамі пэндзля

Выстаўка, падрыхтаваная супрацоўнікамі залы дакументаў па мастацтве аддзела абслугоўвання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, сабрала выданні, якія расказваюць пра гонар і годнасць беларускай кніжнай графікі. А штуршком для аб'яднання іх у адну экспазіцыю стала кніга Вольгі Паўлючэнкі «Малюнак пад кніжнай вокладкай», у якой змешчаны інтэрв'ю з 36 асобамі. У аснове выдання — артыкулы з газеты «Літаратура і мастацтва», дзе аўтар працавала некалькі гадоў.

Як прызналася Вольга Паўлючэнка, работа над кнігай выратавала яе падчас цяжкіх выпрабаванняў лёсу і стала вынікам шматгадовай журналісцкай працы. Матэрыял, назапашаны для газетных старонак, не згубіў свайго кошту, бо кніга — вандроўка ў сусвет думак і разважанняў славутых беларускіх майстроў пэндзля.

На прэзентацыі прысутнічалі героі кнігі — Аксана Аракчэева і Ірына Мацкевіч, былыя калегі журналісткі, сябры і вучні з аб'яднання па інтарэсах «Журналістыка» Палаца дзяцей і моладзі «Золак» г. Мінска.

Вольга Паўлючэнка прадстаўляе сваю кнігу.

Усе прысутныя так ці інакш звязаны паміж сабой кнігай. Выдавец Маргарыта Клябанава пазнаёмілася з аўтарам, калі прадстаўляла грамадскасці выданне «Письма с фронта», а пасля спрычынілася да выхаду ў свет дзвюх кніжак вершаў Вольгі Паўлючэнкі.

Аксана Аракчэева запрасіла журналістку напісаць артыкул для кнігі пра мастака Барыса Аракчэева, а радкі з верша Вольгі Паўлючэнкі пра бэз зрабіла эпіграфам да аповеду пра гісторыю кахання сваіх бацькоў. Ірына Мацкевіч прыгадала, як разам рабілі кнігу «Белорусское кино в лицах» і «Белорусское кино в лицах. Персоналии». А сама гераіня імпрэзы распавяла, як нарадзіўся праект і які шлях пралягаў ад знаёмства з героямі да публікацыі.

«Малюнак пад кніжнай вокладкай» — праект, які ўвасабляе жыццёвы шлях сучасных мастакоў і тых, каго ўжо няма з намі. З кнігі можна даведацца пра іх біяграфіі, факты, якія не знайсці ў інтэрнэце, бо яны ўзятыя з асабістых інтэрв'ю.

Юлія ХАРЛАНАВА
Фота Сяргея Мураса.

Безабароннасць свету мастака

Вячаслаў Паўлавец «без шкла»

Жыццё сучаснага чалавека звязана са шклом: смартфоны, камп'ютары, кінатэатры — усё нагадвае пра бар'еры паміж стваральнікам і гледачом. Для кагосьці гэта непазбежнасць, для іншых — нагода для крэатыву, часам рызыкоўная, як, напрыклад, для аднаго з найвыдатнейшых мастакоў Беларусі, майстра акварэльнага жывапісу Вячаслава Паўлаўца.

Фота Кастуся Дробава.

Выстаўка «Без шкла. 12 акварэлей Вячаслава Паўлаўца» адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Аўтар прэзентуе 12 выбраных пейзажаў з асабістай калекцыі. Усе яны прадстаўлены ў нязвыклай нетрадыцыйнай манеры афармлення графічных твораў — без шкла. У гэтым выпадку карціны становяцца безабароннымі, адкрытымі і быццам прамаўляюць толькі адно: паміж мастаком і гледачом не існуе перашкод. Гэтага не стае ў стасунках людзей са светам, з грамадствам, бо да чалавека зараз трапляе безліч фактаў у бясконцай плыні інфармацыі, якая пазбаўляе каштоўнага часу. Таму яго пачуцці і эмоцыі ператвараюцца ў муляжы, сімулякры і фантомы пачуццяў і эмоцый, лічыць аўтар выстаўкі.

— Адкрытасць, шчырасць, безабароннасць — гэта не слабасць, а моц, якая разам з інтуіцыяй высвечвае шлях да існасці, — адзначае В. Паўлавец. — Гэта не пратэст, а хутчэй роздум над пытаннем перашкод ва ўзаемаадносінах. Гэта рызыка, у нейкім сэнсе экстрым — выстаўляць работы без шкла. Але сучаснае мастацтва набывае розныя формы. Творца з яго дапамогай мае магчымасць паказаць сябе не такім, якім яго кожны дзень бачаць людзі праз знешнасць, адзенне, звычкі, а праз тое, што адлюстравана ў рамках на выстаўцы.

У экспазіцыі прадстаўлены работы розных гадоў: большасць — з серыі «На скрыжаванні лёсу» (2018), а таксама з ранніх «Крокі па вадзе», «Успаміны» і «Чорна-белыя мары». Некаторыя пейзажы па адносінах са светам нагадваюць творы Архіпа Куінджы. Сярод іх — аркуш VII з серыі «Крокі на вадзе», хоць кожны здольны ўбачыць у ім і розны час дня, і няпэўную пару года, і нявызначаны, неакрэслены рух, які, нягледзячы на поўную статычнасць адлюстраванага, усё ж маецца на ўвазе і адчуваецца. На заўвагу пра асацыяцыі з іншым творцам мастак адказвае: яшчэ з тых часоў, калі вучыўся ў мінскай дзіцячай мастацкай школе № 1, і пазней, калі ўжо скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, не пераставаў здзіўляцца ды захапляцца талентам вялікага рускага мастака. Сапраўды, гэты ўплыў усё ж ненавязліва прасочваецца.

Дарэчы, калегі мастака асабліва вылучаюць манахромныя мініміалістычныя пейзажы. У іх, нягледзячы на адсутнасць багацця фарбаў, адчуваецца незвычайная асабістая інтанацыя, якая зачароўвае. Мастака таксама называюць майстрам «пейзажу настрою», незвычайна чуйным да прыроды, да самапазнання чалавека праз прыроду і суіснавання ў гармоніі з ёю. Цікава і тое, што творчасцю В. Паўлаўца захапляюцца як прафесіяналы, якія ствараюць сучасны мастацкі працэс і ўплываюць на яго, так і аматары, якія не валодаюць спецыяльнымі ведамі. Гэты сакрэт застаецца неразгаданым.

У сучасным айчынным мастацтве В. Паўлавец набыў статус захавальніка традыцыі, паслядоўніка вядучых майстроў XX стагоддзя — Аркадзя Астаповіча, Віталя Цвірко, Зоі Ліцвінавай. Для яго творчасць, менавіта працэс, — найвышэйшая мэта. З аднаго боку, ён падтрымлівае высокі ўзровень беларускай рэалістычнай акварэльнай школы, з другога — пастаянна імкнецца да эксперыментаў, ствараючы адмысловы тып акварэлі, працуючы ў манеры *alla prima* — вадкімі фарбамі па вільготнай паперы. Гэта дазваляе падчас творчага працэсу перажыць некалькі хваляў эмоцый, якія мастак не збіраецца хаваць. Усё пачынаецца з накіравання позірку на белы аркуш паперы, які адначасова і вабіць, і палохае. Вядома, існуюць нейкія эскізы, але калі творцу палоніць стыхія каляровай плыні празрыстай фарбы, знікаюць і час, і прастора. Існуюць толькі вобразы, якія змяняюць адзін аднаго. Іх творца называе гасцямі з сусвету падсвядомасці.

— У гэтыя хвіліны разумееш, чаму мастака называюць творцам. Ты можаш накіроўваць аблокі па небе, ствараць лясы, рэкі, азёры, пракладваць сцежкі, дарогі, будаваць замкі. Істотна і тое, што створаны свет не зусім адпавядае твайму плану. Ды і ніколі няма цвёрдага плана: усё пабудавана на спантаннасці, — адзначае В. Паўлавец.

Сапраўдная тэарэма акварэлістаў: калі акварэлі ўласціва расплывацца, то не трэба гэтаму супраціўляцца. Шмат залежыць і ад выбару паперы: фактурная, тэкстурная паводзіць сябе інакш, чым гладкая. Адчуванне матэрыялу, яго ўласцівасцей сапраўды ідзе на карысць. Не дзіўна, што часам В. Паўлавец і сам не ведае, якім будзе вынік, бо дадаюцца фарбы і адценні, што раптоўна здзіўляюць самога аўтара, які зазначае: акварэль не церпіць гвалту, трэба ісці за плынню фарбы, прыслухоўваючыся да падказак. І атрымаецца пачуць яе, нібы сімфонію.

Акварэль самадастатковая. Яна ўвабрала ў сябе найлепшае і ад жывапісу, і ад графікі, і ад сваёй папярэдніцы фрэскі, лічыць В. Паўлавец. Менавіта акварэль сфарміравала яго лад жыцця, неўпрыкмет стаўшы жыццятворчасцю. Многія работы ўжо адносяць да класікі беларускага мастацтва XX стагоддзя. Яны ўваходзяць у альбомы, прыватныя калекцыі. У мінулым годзе творца адсвяткаваў юбілей — 60 гадоў. Але што датычыцца Мастацкага музея, то «Без шкла» — толькі другая персанальная выстаўка, хоць у фондах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь захоўваецца 18 твораў мастака. Першая ж выстаўка — «Перакрыжаванні часу» — адбылася яшчэ ў 2006 годзе. З некаторымі работамі можна пазнаёміцца на віртуальнай экспазіцыі. Між тым хутка ў музеі пройдзе майстар-клас мастака па акварэлі.

Творца не цураецца выставак, у тым ліку што тычыцца сумесных праектаў. Калі лічыць з таго ж 2006 года, то іх было арганізавана даволі шмат толькі ў адным Мінску: персанальныя выстаўкі «Акварэалізм» (2012) і «Крокі па вадзе» (2018) у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, у рэспубліканскай мастацкай галерыі «Палац мастацтва» (2009), у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа (2016), выставачныя праекты «*Tour de* Беларусь. Этап: Мінск — Полацк — Мінск» (2015) і «Зямля пад белымі крыламі» ў Нацыянальным мастацкім музеі (2011), а таксама персанальныя выстаўка «Акварэльны сусвет Вячаслава Паўлаўца» ў Нацыяльным цэнтры сучасных мастацтваў Беларусі (2019). Кажучы пра экспазіцыі ў іншых гарадах, нельга не згадаць «*Art Belarus*» у Варшаве (2010), «Вада+фарба» ў Полацку (ды ў Мінску ў 2011 годзе), а таксама персанальныя выстаўкі ў музеі Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве (2010) і «Каляровая плынь» у Нацыянальным полацкім музеі-запаведніку (2017). Такая кіпучая дзейнасць можа і не здзівіць, калі не ўлічваць тое, што В. Паўлавец усё жыццё працуе мастацкім рэдактарам у розных выданнях. На сённяшні дзень гэта часопіс «Мастацтва».

Дарэчы, летась у Выдавецкім доме «Звязда» выйшаў альбом «Акварэльны сусвет Вячаслава Паўлаўца». У ім 100 акварэлей, створаных на мяжы тысячагоддзяў. Гэта работы апошніх трыццаці гадоў: ад першых самастойных твораў 1980-х да аркушаў, выкананых у 2018 годзе ў Германіі (яго графіка там запатрабавана). У выданне ўвайшлі і творы, што захоўваюцца ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

Аркуш IV з серыі «Чорна-белыя мары». 2006 г.

Варта адзначыць, што экспазіцыя «Без шкла. 12 акварэлей Вячаслава Паўлаўца» размясцілася не ў адной з выставачных залаў, а ў арт-кафэ «Культурнае жыццё» Мастацкага музея. Гэта таксама пэўны эксперымент, на карысць якога граюць дзве рэчы. Па-першае, кафэ — гэта заўсёды выгаднае памяшканне для дэманстрацыі мастацкіх работ дзякуючы вялікай наведвальнасці на працягу ўсяго года. Такі крытэрый безумоўна паспрыяе пазнавальнасці твораў. Па-другое, гэта ўсё роўна тэрыторыя, дзе пануе музейная атмасфера, якая схіляе да роздумаў, прымушае засяродзіцца. Бывае, гэтаму перашкаджаюць і натоўпы ў музеі, і абмежаваны час любой экскурсіі.

Пастаянная натура, крыніца роздумаў творцы — пейзажы старажытнага фальварка Відагошч (цяпер Камсамолец) пад Мінскам, дзе пасля вайны дзед будучага мастака пабудаваў дом. З дзяцінства гэтыя мясціны сталі важнымі як для асобы мастака, так і для яго творчасці. Многія вобразы натхнёныя прыродай гэтага краю. Сёння ў мястэчку майстэрня В. Паўлаўца. Але ад поўнай адданасці натуры ў першыя гады самастойнай работы акварэліст сышоў у прынцыповую імправізацыйнасць, працу па памяці. Мастак усхваліў і ўзвысіў да паэтычнай метафары беларускую прыроду, яе шэры дзень, рэдкі на сонца. Сапраўды, асаблівасць яго работ — у маларухавасці, у амаль поўнай адсутнасці на іх людзей. Але чалавек у творах В. Паўлаўца заўсёды няўлоўна існуе. І гэта сам глядач — яго бачанне пейзажа, успрыманне колераў, свету і ценяў, успаміны, пачуцці і эмоцыі.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Аркуш VII з серыі «Крокі па вадзе». 2018 г.

Цуд часу

Фота з сайта Музея гісторыі беларускай літаратуры.

Аматарскі тэатр складана параўноўваць з тэатрам прафесійным, ацэньваць па тых жа крытэрыях. Але ў непрафесійнага тэатра заўсёды ёсць асаблівы шарм шчырасці, адчування святочнасці не толькі ў гледачоў, але і ў выканаўцаў. Прынамсі, калі стваральнікі моцна захоплены тэмай, гэта заўсёды звяртае на сябе ўвагу. Менавіта такой шчырасцю быў адметны і гэты спектакль.

У Музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася прэм'ера спектакля «Калі радасць бліснула з вачэй», пастаўленага Школай гістарычных танцаў «Капітэль». Сюжэт спектакля створаны паводле паэмы Адама Міцкевіча «Дзяды».

1856 год. Калядны вечар. Ігнат Дамейка ў сваім доме ў Санцьяга пакідае гасцей падчас святкавання. Яго жонка Энрыкета знаходзіць мужа сумным і задумлівым. Той адказвае на пытанне сваёй каханай, што згадвае сваіх сяброў і такі ж калядны вечар — на Радзіме, побач з прамяністымі, у астрозе, у чаканні прысуду па «справе філаматаў».

Спектакль дэманструе два пласты часу: Ігнат Дамейка з жонкай назіраюць за Адамам Міцкевічам, Янам Чачотам, Тамашам Занам і маладым Дамейкам, якія вітаюць Раство Хрыстова ў астрожных сценах. Пастаноўка атрымалася надзвычай эмацыянальная: смех, засяроджанасць, нервовасць, напружанае чаканне, роспач, надзея, пяшчота, рашучасць. Нягледзячы на тое, што спектакль відавочна аматарскі, акцёры ўдала перадалі эмоцыі, паказалі адметнасці характараў. У адным моманце, праўда, надрыў у голасе і ўкленчванне падаліся перабольшаннем, але гаворка ішла пра няшчаснае каханне, прызнанне перад бясконцым расстаннем.

За кароткія сорак хвілін, якія ідзе спектакль, сюжэт паспявае разгалінавацца на замалёўкі пра каханне, сяброўства, веру ў сваю справу. Рэжысёру ўдаецца паказаць сяброў-прамяністых такімі жывымі і сапраўднымі, што ў нейкі момант зала музея быццам пераўтвараецца ў партал і гледачы сягаюць праз два часавыя пласты. Дзеянне аздабляецца спевамі пад гітару, танцамі, чытаннем вершаў — гэта натуральна кладзецца ў паказаную сітуацыю і асвяжае сюжэт. Пасля заканчэння спектаклю акцёры запрасілі гледачоў далучыцца да свята і правялі майстар-клас па гістарычных танцах.

Тэма філаматаў, крыху вядомая ўсім са школьнай праграмы па гісторыі, у сучаснай культуры распрацавана не надта глыбока. Удзельнікі студыі «Капітэль» вырашылі гэта выправіць. Яны займаюцца рэканструкцыяй падзей пачатку дзевятнаццатага стагоддзя ўжо пяць гадоў, і зацікавіліся тэмай філаматаў і філарэтаў ужо даўно. У рэканструкцыі салонаў тагачаснай шляхты гучалі вершы Міцкевіча, Чачота. Таксама ў «Капітэлі» пачалі рэканструяваць спевы, у тым ліку тыя, якія збіраў Ян Чачот. У кіраўніка студыі, якая па сумяшчальніцтве яшчэ і рэжысёр і аўтар сцэнарыя прэм'ернай пастаноўкі, Вікторыі Чаплевай асаблівае стаўленне да гэтай гісторыі: «Увогуле, гэтая тэма — мой асабісты боль. Два гады таму быў юбілейны год філаматаў і філарэтаў, тады гэта для мяне было нечым крыху заезджаным. Я не разумела, чаму ўсе імі так захапляюцца. Калі стала паглыбляцца, чытаць пра іх, зразумела, што гэта ўнікальныя сваёй культурай, духоўнасцю людзі, і яны несправядліва ў нас забытыя. Вядомы адзін Міцкевіч, яго творы, але мала хто ведае: шмат што ён запазычваў у таго ж Чачота. А "Дзяды" яму дапамагалі пісаць і Чачот, і Дамейка. І ў нас саспела ідэя паказаць філаматаў не як паэтаў, а як найперш людзей, якія жылі, гарэлі, любілі сваю радзіму і не баяліся пайсці за яе ў астрог. Спачатку мы паставілі адзін імерсіўны спектакль — больш жартаўлівы, ён называўся "На народзіны да Міцкевіча". І гэтай восенню, калі я працягвала вывучаць тэму філаматаў, натрапіла на "Дзяды", дзе ў адной з частак было апісана іх астрожнае жыццё. Тады ў мяне з'явілася думка пра такі спектакль. Акцёры падбіраліся вельмі доўга, і так атрымалася, што кожны з іх па духу вельмі блізкі да сваіх герояў.

І мы вырашылі паставіць спектакль менавіта ў калядны перыяд, каб далучыцца да ідэі таго, што Раство сапраўды робіць цуды. Але цуд — не толькі тое, што адбываецца звонку, а найперш тое, што адбываецца ўнутры».

Дар'я СМІРНОВА

выДАТна

Тэатральны лёс:

Алена Хрысціч пра любімую прафесію

Свой юбілей Алена Мікалаеўна Хрысціч адзначыла на сцэне — падчас бенефісу і прэм'еры чэхаўскага «Юбілею» ў Маладзёжным тэатры, якому актрыса аддала палову жыцця. Віншаваннем ад калег стаў капуснік, які даў магчымасць удзельнікам раскрыцца з самага нечаканага боку: тэатральныя артысты могуць спяваць не горш за папулярных зорак (ды нават лепш, таму што без фанаграмы), здолелі б скласці канкурэнцыю вядомым рэперам па ўзроўні харызмы (а сэнс слоў наогул па-за канкурэнцыяй), а ўсю іх шчырасць не ўкласці нават у самы лірычны раманс. Галоўная гераіня вечара расчулілася — яркія ўспаміны прымусілі разважаць не толькі пра ўласны лёс, але і пра тэатральны наогул. Некаторымі думкамі яна падзялілася з намі:

МАРА:

— Я марыла быць балерынай, займалася танцамі. Але не было магчымасці гэтую мару рэалізаваць. Аднак яна засталася, і я яе ўвасобіла, — няхай і не стала балерынай, але я на сцэне як драматычная актрыса.

УВАСАБЛЕННЕ:

— Гады вучобы — час самы цікавы: танцы, фехтаванне, літаратура, выяўленчае мастацтва, сцэнічнае маўленне... Тады быў вельмі моцны выкладчыцкі склад у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце. Наш педагог Аляксандр Іванавіч Бутакоў выгадаваў не адно пакаленне артыстаў, і ўсе гавораць пра яго з удзячнасцю. У нас перад вачыма быў дэвіз: «Акцёрам можаш ты не быць, а чалавекам быць абавязаны». Выкладчык выхоўваў высакароднасць.

ТЭАТР:

— Быў курс, які пасля заканчэння інстытута цалкам з'ехаў працаваць у Бабруйск. І я таксама, прапрацавала там 3 гады. А потым мяне запрасілі ў ТЮГ, дзе ставіў спектакль Рыгор Баравік. У выніку гэтаму тэатру я аддала 10 гадоў. А калі стварыўся Маладзёжны тэатр, перайшла сюды, зноў жа дзякуючы Рыгору Іванавічу Баравіку: ён быў пастаноўшчыкам першых спектакляў у гэтым тэатры. Тады яшчэ не мелі свайго будынка, рэпеціраваць даводзілася па начах. Але мы былі маладыя, трымаліся на энтузіязме, жаданні працаваць. У гэтым тэатры я ўжо 35 гадоў, з дня яго заснавання.

РОЛІ:

— Для артыста важная кожная роля. Ты ўсё роўна аддаеш часцінку сваёй душы, і чым складаней даецца вобраз, тым, напэўна, ён даражэйшы.

...Часам заплюшчыш вочы, асабліва пасля спектакля, і ўсё прайграеш зноў і зноў: не, гэта было не так, тут можна па-іншаму... Накатваюць гэтыя думкі, увесь час думаеш, як зрабіць лепш...

Да гэтага часу хвалююся кожны раз перад спектаклямі. Але выходжу на сцэну — і ўжо нічога, супакойваюся. Мы ж робім гэта, каб гледачу было цікава.

МАТЭРЫЯЛ:

— Цікава паспрабаваць сябе і ў драме, і ў камедыі. Прыцягваюць востра-характарныя ролі. Але драма, вядома, акцёрам дае магчымасць максімальна раскрыць сябе. Адзін з нашых першых спектакляў — «Гэтыя незразумелыя старыя людзі» (паводле кнігі Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночы твар»). Складаная тэма. Я іграла Любоў. Мы шмат размаўлялі з ветэранамі, яны дзяліліся ўспамінамі. Трэба было паглыбіцца ў гэтую гісторыю. А інакш — ніяк...

Рыхтавацца да роляў заўсёды складана. Даводзіцца і ў бібліятэку ісці, шмат чытаць дадаткова. Напрыклад, у мяне ёсць і двухтомнік лістоў Антона Паўлавіча Чэхава, і поўны збор твораў. Чытаю яго — вельмі падабаецца. А калі пачаліся рэпетыцыі «Юбілею», думаю: напэўна, не маё. Я іграю спадарыню Мярчуткіну... Але паволі, паволі — і пайшло.

МАЛАДЫМ:

— ...Цярпенне і надзеі. Працаваць, шмат працаваць над сабой. Нават калі нешта не атрымліваецца, нават калі нейкі рэжысёр цябе не так успрымае, усе намаганні ідуць у скарбонку...

ЛЁС:

— Я займаюся любімай прафесіяй. Ведаеце, якое задавальненне, калі выходзіш у фінале спектакля, людзі ўстаюць, дзякуюць. Усё ўнутры дрыжыць ад шчасця. Бо гэта ж шчасце! Няўжо праца? Задавальненне, радасць! Так, праз пакуты, праз церні — да зорак. А як інакш?..

Ларыса ЦІМОШЫК

| | + |: вынікі дэцэнтралізаванага тэсціравання

Фільмы з выразным сацыяльным падтэкстам — гэта заўсёды двухбакова востры меч. З аднаго боку, моцная і актуальная праблема ў цэнтры сцэнарыя хутчэй выклікае глядацкую прыхільнасць і пры паспяховым рэзанансе нават мае шанц неяк паўплываць на праблему, падштурхнуць адпаведныя структуры да яе вырашэння. Але ў той жа час з такім фільмам вельмі лёгка залішне сканцэнтраваць глядацкую ўвагу на вастрыні фактуры, з-за чаго нейкія выключна кінематаграфічныя моманты (як негатыўныя, так і пазітыўныя) могуць зусім знікнуць з поля зроку. І гэта, па сутнасці, пазбаўляе рэжысёра вялікай долі прафесійна-арыентаванага фідбэку, таму толькі і застаецца, што спадзявацца на іншых кінематаграфістаў і крытыкаў (чые меркаванні падвергнуты пэўнай прафдэфармацыі, а значыць, і пазбаўлены нейкага працэнта аб'ектыўнасці, які можна атрымаць толькі ад звычайнага гледача).

На апошнім «Лістападзе», а пазней і ў масавым беларускім кінапракаце з'явіўся новы фільм рэжысёркі Улады Сяньковай «| |» («Два»), які адлюстроўвае сацыяльную экасістэму школы ў шматгалоссі яе характараў і адносін, а таксама паўстае пэўнай лакмусавай паперкай, якая агаляе псіхалагічнае нутро аднаго з найважнейшых асобаўтваральных этапаў у жыцці кожнага чалавека і пакідае ўбаку ўсю фармальна-лічбавую мішуру. Услед за сваімі героямі кіно ўнутры самога сябе робіць некалькі тэстаў і атрымлівае наступныя вынікі.

| | *(дзве палоскі): станоўчы тэст грамадства*

Кожны з галоўных герояў — Насця, Саша і Крысціна — сваёй персанальнай гісторыяй амаль што моўчкі канстатуе: праблемы ў школьнікаў ёсць, і не абыякія. І вытокі гэтых праблем не ўнутры асобных людзей, а дзесьці па-за іх межамі — у чорным гнілым алеі, што змазвае шасцерні нябачных сацыяльных механізмаў.

Хлопец Саша — тыповая ахвяра школьнай траўлі, чыё інтэлектуальнае і ўвогуле культурнае дамінаванне перабіваецца дамінаваннем фізічным (і гаворка пра рэчы больш жорсткія, чым проста збіванне). Нягледзячы на ўражанне цалкам адэкватнай асобы, яго рэтраградная, бы Меркурый, мама ў крытычны момант раскрывае сваю непедагагічную сутнасць і завальвае хлопца гіперклопатам, не заўважае яго дэструктыўнага і псіхалагічна-некарэктнага характару.

Крысціна і яе маці — асобы хоць і з дакладна негатыўнымі рысамі, але негатыўнымі быццам бы не істотна: кожны дзень мы неяк суіснуём з такімі на вучобе ці на

Кадр з фільма «| |» («Два»).

працы, і іх негатыў тым меней уплываовы, чым меней на яго звяртаеш увагі. Але ў фільме істотнасці гэтай чарвяточынцы, зноў жа, дадае соцыум, і гэтым разам той, што ўключае дарослых — бацькоў і калектыў выкладчыкаў. Праблема, якая магла застацца паміж двума людзьмі (і датычылася толькі аднаго чалавека), распаўсюджваецца ва ўсе бакі, чым робіць горш абсалютна ўсім, нават тым, хто, па сутнасці, ніякага дачынення да яе не мае. Дарэчы, што тычыцца дарослых: абсалютная большасць з іх падаецца ў негатыўным ключы, але пры гэтым рэжысёрка не ставіць крыж на цэлым пакаленні, але асэнсавана, без перабольшвання, робіць фокус на тых кавалачках пустэчы, на тых нябачных душэўных ранах, якія засталіся ў цалкам нармальных людзей ад савецкага выхавання.

Насця нашмат болей за Сашу і Крысціну паказвае здольнасці да пераадольвання гнілых сацыяльных механізмаў за кошт сілы волі і актыўнага яе ўжывання. Але нават яе ламае тая лавіна, што вырастае з маленькай крупінкі, і хаця цячэ лавіна ажно ў трох кірунках — унутр самой Насці, у яе прыватную прастору і ў прастору калектыўную, найбольш фатальны і фізічна адчувальны «штуршок», нягледзячы на ўсю ўнутраную моц гераіні, ёй наносіць менавіта удар з боку соцыуму.

Як і было сказана напачатку, гэтае кіно — бескампрамісны дыягназ беларускаму грамадству і нават не званочак, а сапраўдны набат з прычыны ўсяго таго, што адбываецца зараз са школьнікамі. І хаця рэжысёрка ў жаданні не схлусіць нават самых станоўчых герояў надзяляе досыць праўдзівымі падлеткавымі «дэманяткамі», асноўны акцэнт агульнай карціны ўсё роўна дапускае толькі аднаго абвінавачанага — механізм сацыяльна-інстытуцыянальных адносін, на зубах якога круціцца падрастаючае пакаленне.

Па прычыне, вызначанай у самым пачатку, адчуваецца жыццёвая неабходнасць у тым, каб зняць мяса праблематыкі са шкілета кінамовы і ўгледзецца непасрэдна ў касцявую структуру, таму надыходзіць час і для другога тэсту.

| *(адна палоска): адмоўны тэст кінафільма*

Лёгкую збянтэжанасць, якая ўзнікае пасля дастаткова рэзкага абрыву аповеду падчас фінальных цітраў, можна гэтак жа лёгка "вылечыць" цытатай Улады Сяньковай з інтэрв'ю, дзе яна гаворыць, што «| |» — заказ ЮНЕСКА, які спачатку павінен быў быць кароткім метрам. І гэтым фактам «лечыцца» змешанасць уражання ад фільма, аднаўляюцца патрэбныя прычынна-выніковыя сувязі, але сама праблема, тым не менш, застаецца. Пры ўсіх заслугах візуальна-аператарскай і акцёрскай працы карціне хапае ўсяго адной, але вельмі істотнай праблемы, каб ад цалкам пазітыўнага стаўлення да фільма адразу сысці ў хісткае 50/50: гэта яго сярэднеметражнасць, якая фарміруецца выключна па прынцыпе сярэдняга арыфметычнага, бо сцэнарый пабудаваны з кавалкаў падыходаў да поўнага і кароткага метраў, а не з чагосьці аднароднага. Хронаметраж у 61 хвіліну нестандартны непрапарцыянальна, з-за чаго кіно падобна на дарослага чалавека з ножкамі дзіцяці.

Калі брацца перадаць храналагічнае адчуванне фільма, атрымліваецца наступнае: уводзіцца досыць істотная колькасць персанажаў, пачынаюцца іх гісторыі, акрэсліваюцца сацыяльна-праблемныя тэмы, ідзе развіццё і тых, і тых, а ў канцы — такое-сякое завяршэнне атрымліваюць лініі толькі двух герояў (і тое — гэта не зусім завяршэнне, хутчэй нейкая квазікатарсічная паўза, кропка с коскай, якая падагульняе сюжэтную фразу, замест кропкі ці шматкроп'я, якімі закрываецца сказ). Таму атрымліваецца, што для поўнага метра не хапае выразнага «"канцавога" знака прыпынку», каб закрыць і праблематыку, і прыватныя гісторыі герояў, а для кароткага — у карціне зашмат непатрэбных сюжэтных ліній і сцэн, якія не даюць ёй стаць канцэнтраваным мастацкім відэаэсэ з сацыяльным падтэкстам. Такі дысананс, канечне, не перашкаджае фільму быць добрым плацдармам для карыснай рэфлексіі наконт моладзі і ўмоў яе сталення, але дакладна перашкаджае фільму быць добрым фільмам.

Напрыканцы прагляду складваецца ўражанне, быццам стужка, як на ўзроўні асобных гісторый, так і выніковага спалучэння ідэй і эмоцый, засталася ў нейкім чысцілішчы, дзе апынулася па прычыне надзвычай загадкавых абставін, звязаных ці то з выгараннем Улады Сяньковай падчас адаптацыі рэальнага негатыўнага вопыту, ці то з недахопам нейкіх станоўчых першакрыніц для сюжэта, ці то з вымотвальным хістаннем паміж заказам і ўласным поглядам. Абодва тэсты, нягледзячы на крыху розныя ўваходныя дадзеныя, прыходзяць да агульных вынікаў: «Штосьці не так, што — быццам вядома, а як з "не так" зрабіць "так" — цалкам не зразумела». Аптыміст бачыць стакан напалову поўным, песіміст — напалову пустым. Улада Сянькова глядзіць на пусты стакан і нічога з ім не робіць, бо не адчувае смагі.

Данііл ЛЫСЕНКА

Самае страшнае

Мікіта Лаўрэцкі — рэжысёр, з імем якога аўтаматычна звязваеш тое, што кінаабывацелі называюць артхаусам, эксперыментальным, малабюджэтным кіно, мяжой іграва і дакументальнага і маюць на ўвазе, што без падрыхтоўкі да такога мастацтва лепш не падыходзіць і не дакранацца. Апошняя з яго работ, прэзентаваных у Беларусі, называецца «Сашына пекла».

Прэм'ера карціны адбылася ў красавіку мінулага года на Маскоўскім міжнародным кінафестывалі, а беларускаму гледачу была прадстаўлена ў межах кінафестывалю «Лістапад».

«Сашына пекла», здаецца, можна ўспрымаць як эксперымент, які ў сутнасці поўнасцю адпавядае аўтарскаму стылю. Карціна знятая на VHS-плёнку. Візуальны складнік, адпаведна, атрымліваецца зярністы, «шумны», што не толькі цалкам адпавядае чаканням гледача, які пабачыў на афішы імя Мікіты Лаўрэцкага, але і выконвае сэнсавую функцыю — спрыяе пачуццю энтрапіі і экзістэнцыяльнага цяжару, якімі прасякнуты ўвесь фільм.

Рэжысёр абазначае жанр сваёй карціны як эма-хорар. Гэта аўтарскае абазначэнне, невядомае патэнцыйнаму гледачу. Але, пабачыўшы яго, чапляешся за тое, што павінна стаяць за словам «хорар». І Мікіта Лаўрэцкі поўнасцю правальвае такое чаканне. Некалькі рэцэнзій, якія з'явіліся ў інтэрнэце пасля прэм'еры карціны, з гэтага і пачынаюцца: маўляў, чакалі хорар, фільм жахаў, а атрымалася толькі жудасна незвычайна. Першае слова ў фармулёўцы аўтарскага жанру з'явілася невыпадкова. Гэта эмацыянальны хорар. Усё самае страшнае ў ім — унутры чалавечай свядомасці.

Сюжэт расслойваецца на два пласты. У адным звычайны офісны працаўнік Саша ў вольны час стварае біты для папулярнага ў вузкіх колах бельгійскага рэпера Олі. На пачатку фільма Олі прыязджае ў Беларусь, каб сустрэцца са сваім бітмэйкерам і даць адзін амаль падпольны канцэрт. Дэкарацыямі выступаюць вуліцы сучаснага Мінска. Саша жыве ў вузкім здымным пакоі, у які ледзь ўмяшчаецца раскладны фатэль, камп'ютарны стол і сінтэзатар. Інтэрв'ю хлопцы даюць, абапіраючыся на вулічны столік каля ларка з шаурмой, а канцэрт адбываецца ў напаўразбураным памяшканні, дзесьці за прасторай ОК16. У спалучэнні якасці кадраў і лакацый атрымліваецца сапраўдная візуальная дэпрэсія. Але існуе другі сюжэтны пласт, напоўнены дзіўнымі цёмнымі рытуаламі, для якіх настолькі складана знайсці лагічнае тлумачэнне, што здаецца, быццам фокус раптам пераключаецца з рэчаіснасці на нейкую чыста эмацыянальную прастору. І, хаця па мантажы гэтыя сцэны ідуць паслядоўна, ствараецца ўражанне, што дзеянне адбываецца ў паралельных светах — на працягу кожнага дня Саша паступова спускаецца ў сваё пекла.

Адказваючы на пытанні гледачоў пасля лістападаўскага паказу, Мікіта Лаўрэцкі казаў: «Я не ведаю пра свайго героя болей, чым паказана ў фільме. Магчыма, гэта і ёсць самае страшнае — тое, што мы пра яго нічога не ведаем». Перад нашымі вачыма разгортваецца ўнутраная трагедыя, і Мікіта Лаўрэцкі знайшоў вельмі арыгінальны і сучасны сродак яе паказаць.

Галоўны герой, увасоблены на экране Аляксеем Свірскім, выпрамяньвае адчуванне некаторай няёмкасці, няскладнасці. Гэты персанаж мог стаць тыповым незразумелым творцам, але

Кадр з фільма «Сашына пекла».

ім не стаў. Асабліва адчувалася гэта толькі ў адным моманце — сцэне з офіса ў самым пачатку фільма. Яна выглядае крыху адарванай ад агульнага цячэння дзеяння, занадта тыповай і за кошт гэтага штучнай. Хаця зразумела жаданне рэжысёра пашырыць свет вакол галоўнага героя да звычайнага жыцця, элементы, не звязаныя з асноўнай сюжэтнай лініяй падаюцца неабавязковымі.

Своеасаблівую ролю выконвае гераіня Вольгі Кавалёвай, якую Саша і Олі сустракаюць перад канцэртам. Яна быццам увасабляе вонкавы свет, адначасова варожы і такі, які імкнецца зразумець героя, заўважае яго. У гэтым знаёмстве раскрываецца кантраст паміж галоўнымі героямі ў падыходзе да камунікацыі. Каця бярэцца зрабіць відэакліп для рэпера, і ён атрымліваецца своеасаблівым, але вельмі светлым на фоне агульнай атмасферы фільма.

Тое, што самае страшнае ў гэтым хорары будзе ўнутраным, не відавочна адразу. Падабаецца, што аўтар не вызначае для сюжэтаствральнага стану свайго персанажа канкрэтных прычын, нагод, «трыгераў», такім чынам пазбаўляючы героя лішняй ацэнкі. Гэта падаецца актуальным на фоне паступовай дэстыгматызацыі псіхічных захворванняў. Магчыма, у наваствораным жанру ёсць патэнцыял стаць оптыкай для раскрыцця сацыяльна-вострых пытанняў, але ў Лаўрэцкага атрымалася проста гісторыя пра чалавека, у якой метафара і рэчаіснасць пераплятаюцца, становяцца непадзельнымі, і за кошт гэтага эксперыментальная форма здаецца адзінай магчымай формай існавання такой гісторыі.

Дар'я СМІРНОВА

НеверБАЛЬнае прызнанне,

або Выказацца ў танцы

Ці ўсё можна сказаць словамі? Думаецца, часам большай красамоўнасцю валодаюць дотык, узмах, жэст, позірк… Варта толькі вачам сустрэцца, як у сэрцы ўспыхвае штосьці гарачае… Рука дамы ў ажурнай пальчатцы бязважка апускаецца на цвёрдую руку кавалера, позіркі сыходзяцца — і пачынаецца падарожжа ў краіну танца. Пары плывуць як птушыны клін: усё падпарадкавана сістэме, настрою танца. І шэсце скіроўваецца няйначай як у эпоху велічнасці. Класіка прыцягвала заўсёды. Вось ужо 11-ы раз элітарнае мастацтва запальвае сэрцы неабыякавых, тых, хто збіраецца на традыцыйным штогадовым Вялікім навагоднім балі ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

Высокі этыкет балю і сёння дае магчымасць хлопцу адчуць сябе больш упэўненым, а дзяўчыне — жаданай, вытанчанай. Тут пышныя сукенкі пераліваюцца рознымі адценнямі ў святле сафітаў, час бяжыць хутка і мімаволі гулліва думаеш: «Ці не згубіць туфлік?».

Мне выпала магчымасць адчуць бальную атмасферу знутры. І рэпетыцыйныя па і рэверансы расквеціліся кантрольным выхадам на ўрачыстым балі на стары Новы год. Адзінаццаты баль у Оперным заззяў эмацыянальным феерверкам: месяц назад вучаніца на рэпетыцыях, сёння на балі я з нецярпеннем чакала самавыяўлення праз танец, галоўны інструмент якога — цела. І які ж шырокі ў яго дыяпазон невербальных сігналаў! Галоўнае — правільна іх інтэрпрэтаваць, і танцы гэтаму дапамогуць! Сярод іншых эфектных сродкаў невербальнай камунікацыі — адзенне і ўпрыгожванні, што яскрава дэманструе баль.

— Баль прыцягвае старажытнымі прыгожымі касцюмамі, магчымасцю прыбрацца, — адзначае балетмайстар-пастаноўшчык, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Юлія Дзятко. — Для людзей ва ўзросце баль не параўнаецца ні з чым (хоць і ладзяцца для іх розныя мерапрыемствы) — гэта як дакрануцца да чагосьці высокага. І натхніцца адмысловай атмасферай Вялікага тэатра оперы і балета.

Здаецца, баль — гісторыя з мінулага, але ўвасабляецца сёння. Дзякуючы танцу, які па-майстэрску ажыўляе балетмайстар Юлія Дзятко: «Танец — гэта ўсё маё жыццё (з чатырох гадоў), гэта мая праца, пакліканне, натхненне, любоў, дом. Ужо не ведаю, як без яго. Хоць цяпер не танцую, але ўсё роўна ў танцы. І кожны адгукаецца ў душы па-свойму. Сказаць, што я люблю ставіць і танцаваць вальс — значыць абмінуць польку… Мне падабаецца ўсё: і паланэз, і вальс, і кантрданс, і полька».

Баль збірае шмат адданых прыхільнікаў, некаторыя з якіх танцуюць ажно з першага сезона, гэта карыфеі са стажам. Вольга Санельнікава, напрыклад, адтанцавала ўжо 6 сезонаў. «Нашых бальных заўсёднікаў не палохае тое, што з кожным годам праграма харэаграфічна ўскладняецца, хай не па малюнках, бо зала не дазваляе, — тлумачыць Юлія Дзятко. — Аднак танцы робім такія, каб справіліся ўсе».

Юлія Дзятко гаспадарыць на балі чацвёрты год і ўжо стала яго сімвалам. Для яе баль — хутчэй не работа, а покліч душы, а яшчэ — добры спосаб трымаць бадзёры настрой: «Мне гэтая дзейнасць вельмі падабаецца, асабліва калі ёсць свая каманда, зладжанасць, калі разумеюць з паўслова, тады працаваць — адно задавальненне».

Асістэнт балетмайстра-пастаноўшчыка Павел Чванаў трэніруе ўжо трэці сезон:

— Я танцую з пяці гадоў. Першапачаткова займаўся класікай. Так атрымалася, што побач з класічнай аказалася зала, дзе выкладалі бальныя танцы. Мая танцавальная кар'ера пачалася ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі. Да трэнерскай дзейнасці

Галоўны танцмайстар балю Юлія Дзятко (злева) і асістэнт Юлія Корсун — увасабленне вытанчанасці і грацыі.

танцамі я займаўся больш чым 10 гадоў. Амплуа трэнера мне па душы, як і працэс выкладання, асабліва калі бачыш, што ў танцораў атрымліваецца, яны ідуць са шчаслівым выразам твару.

Танец і душа для Паўла непадзельныя: «Бывае, іду па вуліцы і адначасова прадумваю рухі, харэаграфію, і мінакі міжволі ўсміхаюцца, калі бачаць, як я паціху падтанцоўваю (з амплітудай: мне ж патрэбна прастора)... Вось так, прыдумляючы новы рух, раблю іншых крыху больш шчаслівымі».

А з чым звязана бальнае прыцягненне? Хтосьці да балю рыхтуецца цэлы год: шыюць сукенку, да дэталяў прадумваюць вобраз — жывуць гэтым. Сёлета ў конкурсе на найлепшы касцюм перамагла Вераніка Пастарнак. Шматгадовая адданасць балю — найлепшае сведчанне яго высокай місіі і запатрабаванасці.

«На балі можна сустрэцца, пагаварыць, гэта высокасвецкае мерапрыемства, а яшчэ — магчымасць атрымаць задавальненне ад танца, атмасферы», — перакананы Павел Чванаў. Ды, верагодна, першачарговая на балі — апантанасць танцам, што перадаецца ад трэнера танцорам. «Танец ідзе са мной па жыцці, — гаворыць Павел. — Для мяне гэта штосьці такое прыгожае, як захад сонца, яркае, як салют, заспакаяльнае — як марскі брыз».

Пэўна, марскую стыхію на балі ўвасабляе велічны паланэз — як шаноўны гаспадар: ён урачыста адкрывае танцавальную праграму. І вось пары прыгожа паплылі, далікатна ўказваючы ў такт нагой. «До за до», перакідка, паклон, абводка — фігуры адна за адной, і танцавальнае падарожжа разам з ласкавым брызам набірае хаду. Сінхроннасць пар стварае неверагоднае відовішча: кавалеры стаяць тварам да цэнтра, дамы — насупраць, потым сыходзяцца. Пазней кавалер будзе чакаць даму, стоячы на калене. Зала — прастора адухаўлення. І сола дам — як танец птушак. Перакідка, і ўрачысты крок паланэза — шырока, грацыёзна, быццам самадастатковае цячэнне глыбакаводнай ракі.

Кацярына Гладкая і Максім Катовіч прыйшлі на баль упершыню: захацелася адчуць штосьці новае, ды і, вядома, прыгожа прайсціся ў адмысловых векавых па.

Курсант авіяцыйнага факультэта Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь Павел Брышцен упадабаў паланэз, а яго сябра курсант Юрый Тарасевіч — вальс: тут, на яго погляд, больш пачуццёвых рухаў, вытанчаных фігур. Дарэчы, танчаць на балі курсанты Ваеннай акадэміі з факультэтаў проціпаветранай абароны, сувязі і аўтаматызаваных сістэм упраўлення, агульнавайсковага, унутраных войскаў... Іх парадная форма і падцягнутая паставa для дам — замілаванне, нагода для гордасці і павагі. Асабліва калі на балі яны дэманструюць найлепшыя мужчынскія якасці, даючы даме магчымасць адчуць сябе пад надзейнай абаронай, сапраўднай жанчынай.

Баль вабіць не толькі суайчыннікаў — заўсёднікі тут і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Фа Ва — з Кітая, ён аспірант факультэта міжнародных зносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, на балі ўжо другі раз: «Я люблю танчыць. І больш вальс: ён вельмі эстэтычны».

Як і кантрданс, які падобны на ўспышку гарэзлівасці, весялосці. Тут пастаяннае ўзаемадзеянне: вось пары мяняюцца, каб потым сысціся і, узяўшыся за рукі, рушыць у рытмічным кроку. Усё аздабляецца паклонамі ўправа, улева. Адмысловая фігура — калі чацвёркі змыкаюць рукі ўгары — атрымліваецца свечка. Але самая чаканая фігура — «шэн»: крок наперад — сустрэча з новым партнёрам, і так чатыры разы. Позірк новага партнёра — як іскра. Што б маглі выказаць вочы дамы ў тыя часы? Перажыванне, надзею? Фігура «шэн» — разынка кантрданса: крочанне насустрач новаму партнёру, падаванне яму рукі і вітанне позіркамі прыемна кружыць галаву. Незвычайная фігура — так званыя домікі: адна пара трымае рукі ўгары, а другая «нырае» ў створаны такім чынам домік, потым чаргуюцца. Прыгожа, калі пары мяняюцца, пераходзячы наперад адна адной, — своеасаблівы жывы фантан пад акрыленую мелодыю кантрданса. Увогуле, у гэтым танцы ўсё пабудавана на замене з партнёрамі — бясконцы рух, інтэрактыў. І фінал — тэмпераменты паклон з заваротам і выкідам рукі ўверх — як клічнік. Яркая імклівая музыка кантрданса здольна перанесці ў часы вірання баляў і падарыць россып пачуццяў. Пэўна, у гэтым параўнацца з кантрдансам можа толькі полька, у нечым свавольная і непрадказальная. Зала тэатра задае настрой узнёсласці, і ты дыхаеш эпохай, узнімаешся над будзённасцю. Сілуэты дам нагадваюць зіхаценне агеньчыкаў на святочнай ёлцы. Ды вытанчаныя строі найбольш выразна лунаюць у вальсе.

Вальс заварожвае з самага пачатку: арыстакратычны паклон быццам задае тон танцу. Далікатнасць — у кожным нюансе: мужчыны стрымана робяць ківок галавой, жанчыны злёгку прысядаюць на нагу. Фігуры «люстэрка», «до за до з паваротам» — і дама праносіцца вакол партнёра, каб пасля зліцца з ім у вальсавым ходзе. Праменад па коле — непераўзыдзены жывапіс: дамы — як пушынкі, як сняжынкі, якіх так не хапае гэтай зіме. Ідэальнае вальсіраванне, пары ва ўнісон, на тварах — захапленне, прадчуванне палкага пачуцця, узаемнасці. Як лодкі злёгку хітаюцца на вадзе пад ласкавым ветрам — так пары быццам гайдаюцца ў вальсіраванні. Здаецца, не спыняцца, бо прагнуць новага пад'ёму. Калі плаўнымі лініямі класічных па ў вальсе перадаецца любоў, то імклівым каскадам рухаў у польцы — іскрамётнасць, флірт. Зліццё музыкі і харэаграфіі — неверагодны эмацыянальны напал. Эфектнае масавае перамяшчэнне пар падобна на слізганне лебедзяў па воднай гладзі. А потым — палёт, адухоўлены шчырым пачуццём. І пары такія праўдзівыя, быццам драматычныя акцёры.

Яркую вобразнасць давала арганічная сувязь з музыкай. Музыка вызначала характар кожнага танца, яго тэмп і рытм. Французскі балетмайстар XVIII ст. Новер у сваёй кнізе «Пісьмы аб танцы і балетах» адзначаў: «Танец, адлюстроўваючы мелодыю, з'яўляецца рэхам, якое паўтарае тое, што гаворыць музыка». Малюнак рухаў ствараў дзівосную эмацыянальную атмасферу. Свята віравала.

Выразнасць дзеі — ад гармоніі музыкі і танца, рухаў і душэўных фарбаў. Вісарыён Бялінскі, рускі літаратурны крытык XIX стагоддзя, называў танец скульптурай, якая рухаецца, — пластыкай, што пакінула свой п'едэстал. Ці не для таго, каб «высякаць са свайго цела агонь і выразнасць», як раіў Новер. І запальваць сэрцы.

Праграма балю ўражвала змястоўнасцю і дынамічнасцю. З кожным годам арганізатары стараюцца разнастаіць свята, унесці штосьці новае і здзівіць. Сёлета балем кіраваў Галівуд. Па чырвонай дарожцы прайшліся Чарлі Чаплін, Ніколь Кідман, Лайза Мінэлі, Кэмеран Дзіяс, Ума Турман, Джон Траволта… А рэй вялі непараўнальныя зоркі оперы Мансэрат Кабалье (Святлана Марусевіч) і Лучана Павароці (Дзмітрый Шабеця). Адметнасць балю 2020-га — неверагодна насычаны канцэрт-сюрпрыз «А карабель плыве» на галоўнай сцэне тэатра: зорны карабель наведалі вядомыя артысты Вялікага Ніна Шарубіна, Уладзімір Пятроў, Ілья Сільчукоў, Вікторыя Красінская, Дзмітрый Шабеця, Таццяна Трацяк, Ілья Гагідзэ (у ролі Лучана Павароці), Віктар Мендзелеў (Чарлі Чаплін)... Усіх пакарыла Ціна Цёрнер у выкананні Анастасіі Вахомчык, таксама Мэрылін Манро (Алена Таболіч), Фрэнк Сінатра (Станіслаў Трыфанаў)…

А хацелі б зазірнуць у выязное казіно, дзе грошы не патрэбны? А яшчэ — на музычныя віктарыны, караоке, фотазоны... Пляцоўкі працавалі сінхронна, і ад насычанасці займала дух. Сінема-баль перадаваў эстафету Чаплін-балю. Традыцыйна ўзялі ў палон забавы, батлы, майстар-класы, зоны адпачынку, фотасесіі, самай запатрабаванай з якіх стала фотабудка — аператыўны пункт сэлфі з імгненным друкам фотакарткі (даўжэзная чарга — менавіта сюды). І ці трэба гаварыць, што ўсё багацце праграмы ахапіць аказалася ледзь магчымым... Працягнуць наступным разам?!

Наталля СВЯТЛОВА, фота аўтара

Скарбонка Спадчыны

Фота БелТА.

Падчас абраду «Тры каралі».

Магія абярэга,

альбо Як адзначылі Каляды ў двух куточках Беларусі

Скончыліся Каляды — нагода падвесці рысу і святкаванням, і нашай «Скарбонцы спадчыны». Сапраўды, мы часам забываемся на свае вытокі, традыцыі і святы, якія з цягам часу па розных прычынах, што ад нас і залежаць, і не залежаць, сыходзяць у нябыт. Але так ці інакш агульнымі намаганнямі мы самі ствараем і захоўваем гэтую скарбонку спадчыны.

На працягу года «лімаўская» «Скарбонка» поўнілася самым адметным і цікавым у народнай культуры. Час завяршыць рубрыку, ставячы яшчэ нятлустую кропку. А пакуль да вашай увагі — абрады калядавання, якія прайшлі розныя іспыты часам, не страціўшы каштоўнасці для беларусаў.

Абрад калядавання «Тры каралі» адрадзілі на Гродзеншчыне. У аграгарадку Ваверка Лідскага раёна кароткі зімовы дзень 6 студзеня адзначылі па-асабліваму. Ідэя вярнуць традыцыю ўзнікла яшчэ ў 2016 годзе. З таго часу ў межах этнапраекта «Абрады маёй краіны» Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці кожны год узнаўляў свята па дакументах, згадках і сведчаннях. Абрад у гэтай масцовасці не праводзіўся з 50-х гадоў мінулага стагоддзя. Але яшчэ жывуць тыя, хто бачыў і памятае, як праводзілі «Тры каралі» ў 30-я гады, калі Заходняя Беларусь належала Польшчы.

Традыцыя «Трох каралёў» уласціва вёскам, дзе большасць жыхароў — каталікі. Свята Аб'яўлення Пана. Урачыстасць устаноўлена ў гонар падзеі, апісанай у Евангеллі: пакланенне мудрацоў, якія крочылі за першай каляднай зоркай, Збавіцелю. Яны прыйшлі ў Бэтлеем, каб знайсці нованароджанага, і прынеслі яму дары. Імёны мудрацоў-вешчуноў Каспер, Мельхіёр і Балтазар. Каталікі ў гэты дзень павінны ўдзельнічаць у святой імшы. Асвячаецца крэйда, якой каталікі традыцыйна пазначаюць дзверы сваіх дамоў крыжыкамі і імёнамі трох каралёў, пішуць «К+М+Б» і ставяць дату ад Нараджэння Хрыста. Гэты надпіс лічыцца вялікім абярэгам ад бяды.

Адметна, што пасля прыходу «каралёў» людзі варажылі. Дзяўчаты, напрыклад, выбягалі на падворак і хапалі дровы. Калі ў руках засталася цотная колькасць, сёлета будзеш у пары, калі не, то застанешся адна. Аналагічным было выбегчы на вуліцу і абняць плот: цотная колькасць азначала замужжа. Таксама спрабавалі варажыць, паклаўшы пад падушку паперкі з мужчынскімі імёнамі. Раніцай маці падымала з ложка і прасіла цягнуць паперку — напісанае там імя і будзе насіць будучы муж.

Нягледзячы на змены і абставіны, якія скарэкціраваў час, сутнасць каляднага абрада засталася ранейшая: мужчыны ў касцюмах вешчуноў (трох мудрацоў) з песнямі завітваюць у госці да землякоў і віншуюць іх з вялікім святам. «Сёння ў Бэтлеем, сёння ў Бэтлеем дзіўная навіна! Марыя Панна, Марыя Панна нарадзіла сына!» З гэтай песняй калядоўшчыкі Ваверскага Дома культуры прыйшлі сёлета ў хаты вяскоўцаў, стаўшы жаданымі і доўгачаканымі візіцёрамі. Гасцінныя гаспадары запрашалі да святочнага стала, частавалі прысмакамі, уручалі падарункі. Жыхары Ваверкі прыкмячаюць: традыцыю калядаваць на свята Трох каралёў тут будуць працягваць, знаёмячы з абрадам жыхароў навакольных вёсак.

Зусім іншае аблічча набылі Каляды ў адным мястэчку на Гомельшчыне. У вёсцы Рэпішча Чачэрскага раёна, ужо на праваслаўныя Каляды, праводзіцца абрад «Перанос іконы і свечкі». Традыцыя ўзяла пачатак больш як паўстагоддзя таму. Пасля аднаўлення вёскі, што была цалкам спалена падчас Вялікай Айчыннай вайны, жыхары, якія ацалелі, набылі ікону «Раство Хрыстова» і пачалі штогод пераносіць яе з хаты ў хату ў якасці абярэга. Нават нягледзячы на панаванне атэізму ў савецкі час, абрад не забараняўся.

Традыцыя захавалася да нашага часу, хоць у вёсцы зараз жыве не больш як 15 карэнных жыхароў. Яны збіраюцца на святочную службу, а потым пераносяць абраз, а таксама лікі Хрыста Спасіцеля і Божай Маці. Дарогу, па якой яго нясуць, усцілаюць саломай, а працэс суправаджваецца малітвамі і песнапеннямі. Завітваючы ў новую хату, людзі папярэдне тройчы праходзяць пад іконай, пакрытай вышываным ручніком. Каля парога дома, які прымае свячу новага года, адбываецца магічны танец з хлебам-соллю, што выпякалі абедзве гаспадыні. Святочныя вячэры рыхтуюцца ў абодвух дамах.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснік галоўнага рэдактара — 377-99-72
адказны сакратар — 377-99-72
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 377-99-72
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк 16.01.2020 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 925

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ —206

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.